ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год. выд. 32
№ 47 (1788)
11 чэрвеня 1963 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

■ НАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ КУЛЬТАСВЕТРАБОТЫ ■ АРТЫКУЛ М. ЛУЖАНІНА АБ ПЕРШЫХ КНІЖКАХ ■ ДА СУСВЕТНАГА КАНГРЭСА ЖАНЧЫН ■ НАД ЧЫМ ПРАЦУЮЦЬ МАСТАКІ ■ КАНЦЭРТЫ КАМЕРНАГА АБАНЕМЕНТА

НАСУСТРАЧ ПЛЕНУМУ ЦК КПСС

ЛЕКЦЫІ ПА ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВУ

Звыш тысячы лекцый чытаецца цяпер штодзённа лектарамі рэспубліканскага Таварыства па распаўсюджванню палітычных і навуковых ведаў.

— У дні падрыхтоўкі да Пленума ЦК КПСС,—сказаў нашаму карэспандэнту адказны сакратар праўлення таварыства Р. Гужавін, — асабліва ўзмацнілася лекцыйная работа. У тэматыцы лекцый немалое месца займаюць пытанні літаратуры і мастацтва. Секцыя па мастацтву, якую ўзначальвае заслужаны дзеяч культуры БССР В. Захараў, нядаўна абмеркавала вынікі работы і намеціла задачы па далейшаму паляпшэнню лекцыйнай прапаганды. Да чытання лекцый прыцягнута шырокае кола работнікаў мастацтва.

200 ПРЭМ'ЕР

Драматычны калектыў Полацкага завода шкловалакна паказаў прэм'еру спектакля па п'есе Г. Юганасоўскага «На паўночны захад ад Берліна». Пастаноўку ажыццявіў рабочы Н. Манохін — заўочнік Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. У галоўных ролях заняты аператар Ю. Перэдзлі, слесар А. Радзіцеляў, ткачыха В. Шахавалава.

Народны тэатр Палаца культуры Аршанскага льнокамбіната паказаў гледачам спектакль па п'есе лаўрэата Ленінскай прэміі М. Пагодзіна «Трэцяя патэтычная». Незабыўны вобраз Ул. І. Леніна стварыў загадчык мастацкай майстэрні прадпрыемства Барыс Арлоў.

На Віцебшчыне многа таленавітых драматычных калектываў. Артысты-аматары Палаца культуры Віцебскага домабудаўнічага камбіната рыхтуюцца паказаць камедыйны спектакль «Над Акой-рэкой» А. Сімукова. Пастаноўку ажыццяўляе слесар дрэваапрацоўчага цэха камбіната С. Кошнікаў. Сваю работу аматары сцэны прысвячаюць Пленуму ЦК КПСС.

Самадзейныя драматычныя калектывы вобласці рыхтуюць каля 200 прэм'ер. Многія з іх будуць паказаны ў пярэдадзень і ў дні работы Пленума ЦК КПСС.

БЕЛТА.

КЛУБ, ЯКІМ ХОЧАЦЦА ЯГО БАЧЫЦЬ

У НАШЫМ горадзе працуюць восем ведамасных і трынаццаць прафсаюзных клубаў, тры кінатэатры, некалькі дзесяткаў бібліятэк, музей, музычна-драматычны тэатр і два народныя тэатры.

Прайдзіце вечарам па вуліцах Бабруйска і вы пераканаецеся, што найбольш мнагалюдна ля пад'ездаў тых клубаў, якія падрыхтавалі новы цікавы канцэрт, каля таго кінатэатра, на экране якога ідзе вясёлая кінакамедыя. Павышаная патрабавальнасць савецкіх людзей да дзейнасці ўстаноў культуры, нецярпімасць да шэрасці і аднастайнасці вымушае клубы і бібліятэкі перабудоўваць сваю работу, шукаць новае.

Дыяпазон дзейнасці культасветустаноў пашыраецца. Напрыклад, пры кінатэатры «Пралетарый» працуе лекторый, у кінатэатры «Таварыш» гледачы перад пачаткам сеанса маюць магчымасць паслухаць канцэрт мастацкай самадзейнасці, а бібліятэка імя Пушкіна правяла больш дзесяці вечароў моладзі, прысвечаных маральнаму кодэксу будаўніка камунізма. Наш музычна-драматычны тэатр, а таксама народныя тэатры, акрамя спектакляў, наладжваюць яшчэ вечары-канцэрты для працоўных горада. Клубы работнікаў мясцовай прамысловасці, фанера-дрэваапрацоўчага камбіната і настаўнікаў часта арганізоўваюць вечары адпачынку. У гэтых асяродках культуры няблага працуюць гурткі мастацкай самадзейнасці і універсітэты культуры, ёсць свае музычныя студыі.

Мне прыемна пісаць пра тое, што ў Бабруйску 76 калектываў мастацкай самадзейнасці. У іх аб'яднаны аматары драматычнага мастацтва, сольнага і харавога спявання, музычнага, танцавальнага і г. д. Каля сямі тысяч працоўных горада наведваюць самадзейныя гурткі, павышаюць там свае веды, удасканальваюць майстэрства.

Гарадскі камітэт партыі нядаўна распрацаваў рад мерапрыемстваў, накіраваных на далейшае развіццё самадзейнага мастацтва — важнага сродку ідэалагічнага выхавання працоўных. У пяці скверах мы робім летнія адкрытыя канцэртныя пляцоўкі. Плануем, што кожную суботу і ў нядзелю на гэтых пляцоўках будуць выступаць самадзейныя артысты. Прымаюцца дзейсныя захады, каб папоўніць рэпертуар самадзейных калектываў творамі сучасных аўтараў. Так, напрыклад, калектыў клуба мясцовай прамысловасці рыхтуе вечар народнага танца. Канцэртная праграма будзе складацца з дзесяці народных танцаў. Народны тэатр клуба работнікаў мясцовай прамысловасці падрыхтаваў спектакль «Чамадан з наклейкамі» Д. Угрумава. Падабраны рэпертуар для музычна-драматычных кампазіцый на розныя тэмы.

Усімі гэтымі справамі займаецца спецыяльная дружына культуры, у якую ўвайшлі на грамадскіх асновах 19 чалавек. У яе складзе рэжысёр музычна-драматычнага тэатра тав. Амельчанка, дырэктар тэатра тав. Вітоўскі, дырэктар музычнай школы тав. Бычкоў і іншыя таварышы, якія працуюць на ніве культуры. Наша дружына культуры аказалася ініцыятыўнай творчай самадзейнай арганізацыяй. Яна ўзяла пад свой кантроль ідэйны змест рэпертуару самадзейных калектываў, дбае і пра тое, каб аказаць аматарам самадзейнай сцэны творчую дапамогу. Для харэаграфічных калектываў распрацавана некалькі арыгінальных сюжэтных танцаў. Прагледжаны рэпертуар эстрадных аркестраў.

Бясспрэчна, што цэнтрам культурна-масавай работы сярод насельніцтва з'яўляецца клуб. Само жыццё падказвае, што гэты асяродак культуры павінен абслугоўваць літаральна **ўсіх** працоўных таго раёна, дзе ён знаходзіцца. У нас жа не пераадолены яшчэ ведамасныя бар'еры, якія (я цвёрда ў гэтым перакананы) шкодзяць нашай агульнай справе.

У Бабруйску ёсць 21 клуб, 1 кожны з іх мае свайго гаспадара. Возьмем хоць бы такі прыклад. Вось клуб фанера-дрэваапрацоўчага камбіната. Добра працуе гэтая ўстанова культуры. Намаганні партыйнай, прафсаюзнай і камсамольскай арганізацый камбіната скіраваны на тое, каб лепш абслужыць калектыў свайго прадпрыемства. Але на гэтай жа рабочай ускраіне горада знаходзяцца яшчэ завод гумавых тэхнічных вырабаў, скураны камбінат, гідролізны завод. Што ж рабіць гэтым калектывам, у якіх таксама ёсць нямала аматараў самадзейнага мастацтва, якія хочуць і лекцыі наведваць і на вечарах прысутнічаць? Бо клуб жа фанера-дрэваапрацоўчага камбіната — адзіная ў гэтым раёне горада ўстанова культуры. Але гаспадар клуба — прафсаюзная арганізацыя камбіната — не ўлічвае гэта.

Нагадаю яшчэ адзін прыклад. У другім раёне горада размешчаны суднарамонтны завод, водная прыстань, хлебакамбінат і чыгуначная станцыя. З іх самы маленькі калектыў — чыгуначнікаў, 1 ім належыць клуб. Яго мала хто наведвае, там заўсёды пуста, а побач жывуць і працуюць людзі, якім няма дзе праводзіць вольную часіну.

Вывад напрошваецца сам: клубы павінны быць не ведамаснымі, а тэрытарыяльнымі, агульнадаступнымі. Для карысці справы ўсе клубы і бібліятэкі варта перадаць Саветам дэпутатаў працоўных, падначаліўшы іх аддзелам культуры выканкомаў мясцовых Саветаў.

Як часта даводзіцца слухаць скаргі на тое, што нашы клубы ператварыліся ў філіялы кінатэатраў паўторнага фільма. У гэтых скаргах ёсць, як кажуць, часцінка ісціны. Сапраўды, замест арганізацыі цікавых лекцый і дакладаў, тэматычных вечароў, канцэртаў, што з'яўляецца асноўным абавязкам клуба, у ім уся работа зводзіцца да дэманстрацыі фільмаў і танцавальных вечароў. Гэта лягчэй і прасцей. Часам, праўда, падобны крок дыктуецца фінансавымі меркаваннямі, трэба ж аплачваць кіраўнікам гурткоў і г. д. А можа, варта дазволіць клубам праводзіць вечары адпачынку працоўных за невялікую плату?

Варта падумаць і аб тым, каб перавесці клубы на гаспадарчы разлік, замацаваўшы за імі групу прадпрыемстваў і ўстаноў, якія размешчаны ў раёне, дзе знаходзіцца той ці іншы асяродак культуры. Такім чынам, за яго работу будуць несці адказнасць партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі бліжэйшых прадпрыемстваў і ўстаноў.

І ў развіцці мастацкай самадзейнасці ў нас ёсць нямала перашкод. Існуе, напрыклад, такі парадак, калі кожная прафсаюзная арганізацыя, кожнае прадпрыемства ці ўстанова павінны мець сваю самадзейнасць. Але ці трэба гэтага дамагацца? Якая карысць, напрыклад, ад таго, што на фабрыцы мастацкіх вырабаў і на некаторых іншых прадпрыемствах горада гурткі створаны, але ім няма дзе выступаць з канцэртамі, нават цяжка знайсці месца для рэпетыцый. Ці не той гэта славуты фармалізм, з якім мы павінны рашуча змагацца.

І яшчэ адна акалічнасць. Ці маем мы права патрабаваць, каб, скажам, у народным тэатры пры клубе мясцовай прамысловасці прымалі ўдзел **толькі** работнікі гэтай сістэмы. А калі на іншых прадпрыемствах ёсць здольныя творчыя сілы? Што ім рабіць? На маю думку, усю мастацкую самадзейнасць трэба сканцэнтраваць пры клубе. Менавіта там народныя таленты атрымаюць магчымасць добра развівацца, набываць майстэрства.

Ізалявана ад культурнага жыцця горада працуюць у нас, як мне здаецца, гарадскія аддзелы культуры. Яны не сталі тым баявым штабам, дзе нараджаюцца новыя формы работы. Гэта цалкам датычыцца і нашага гарадскога аддзела культуры, які фактычна ні за што не адказвае. Так павялося ўжо, што кінатэатры і бібліятэкі непасрэдна падпарадкоўваюцца абласному прамысловаму ўпраўленню культуры і абласной бібліятэцы, кніжныя магазіны — аблкнігагандлю, клубы — прафсаюзным арганізацыям. Чым жа тады займаецца гарадскі аддзел культуры, якія яго абавязкі і функцыі? Збіраць зводкі ды дакладныя?.

У гэтым артыкуле я ўзняў толькі некаторыя пытанні культурна-масавай работы ў горадзе. На маю думку, яны заслугоўваюць самай пільнай увагі і абмеркавання.

Л. БУРКО,
сакратар Бабруйскага гаркома партыі.

НАВУЧАЛЬНЫ ГОД ЗАКОНЧАНЫ...

З ДЫПЛОМАМІ КАНСЕРВАТОРЫІ

У Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі адбыўся чарговы, дваццаць трэці выпуск. Дыпломы атрымалі звыш 60 музыказнаўцаў, вакалістаў, дырыжораў, музыкантаў-выканаўцаў. Выпускнікі кансерваторыі накіраваны на працу ў тэатры, мастацкія калектывы, музычныя вучылішчы. У Тэатры оперы і балета будуць працаваць Л. Татарская, Ул. Скараходаў, В. Мяркулаў, у Тэатры юнага гледача — В. Карасенка. Выхаванцы кансерваторыі папоўнілі калектывы артыстаў філармоніі, Дзяржаўнай харавой капэлы, Беларускага радыё.

Многіх выпускнікоў чакае педагагічная дзейнасць. Яны накіраваны ў музычныя вучылішчы Брэста, Гродна, Маладзечна.

НА НОВАБУДОЎЛІ

Студэнты другога курса мастацкага факультэта Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута выехалі ў Полацк. Тут, на Нафтабудзе, пад кіраўніцтвам мастака І. Стасевіча яны пройдуць сваю летнюю практыку. У ваколіцах вёскі Баравікоўчына Івянецкага раёна працуюць першакурснікі. Іх творчай работай кіруе мастак Х. Ліўшыц.

Жывапісцы і графікі трэцяга курса вывучаюць жыццё і працу рабочых Мінскага трактарнага завода. Сёлета студэнты мастацкага факультэта пабудуць на многіх прадпрыемствах і ў калгасах рэспублікі.

ПЕРШАЯ Ў РЭСПУБЛІЦЫ

Рэспубліканская спецыялізаваная школа-інтэрнат закончыла першы навучальны год. Пяцьдзесят здольных дзяцей вывучалі тут, акрамя агульнаадукацыйных прадметаў, музыку і выяўленчае мастацтва. Віланчэль, скрыпка і піяніна — такія класы ў групе музыкантаў. У групе мастакоў дзеці атрымалі першыя ўяўленні аб жывапісе, кампазіцыі, малюнку.

Мінская школа-інтэрнат, якая спецыялізуецца па музыцы і выяўленчаму мастацтву, пакуль што адзіная ў рэспубліцы. Выкладчыкі С. Каткоў, Л. Кубліцкая, Б. Моткін і іншыя вядуць тут не толькі педагагічную, але і творчую работу.

Вучні цяпер у лагеры. Сюды ж перанесена вучэбная практыка. А ў інтэрнаце разгарнулася падрыхтоўка да прыёму новага папаўнення.

МАЛАДЗЕЧАНСКІЯ СТУДЫЙЦЫ

У Маладзечанскім гарадскім Доме народнай творчасці адбыўся першы выпуск самадзейнай студыі выяўленчага мастацтва. Адкрыта справаздачная выстаўка работ студыйцаў. Гэта чатыры сотні розных экспанатаў. Прыцягваюць увагу накіды і малюнкі з натуры чалавечай фігуры, пейзажы, эскізы кампазіцый. Сярод жывапісных работ ёсць цікавыя нацюрморты ў тэхніцы акварэлі і першыя доследы ў мужчынскім партрэце. Вылучаюцца творы скульптара П. Герасіменкі, работы самадзейных мастакоў Д. Юдовіна, Е. Хацькова, Г. Муклановіча (ён у 1962 годзе атрымаў першую прэмію на Усесаюзным конкурсе малюнкаў у Маскве).

Выпускнікі студыі атрымалі пасведчанні на права кіраваць у школах і клубах гурткамі выяўленчага мастацтва.

Маладзечанская студыя самадзейных мастакоў аб'явіла новы набор.

ПА НОВАЙ ПРАГРАМЕ

У чэрвені спаўняецца 35 гадоў Магілёўскаму культасветвучылішчу. За час існавання вучылішча, — паведаміў нам намеснік дырэктара па вучэбнай частцы Ф. Худажылаў, — яго скончыла каля 5.000 чалавек. Сёлета выпушчана 68 клубных работнікаў. Усе яны накіраваны на працу ў сельскія асяродкі культуры.

Маладыя спецыялісты вучыліся па новай праграме. Кожны з іх зможа кіраваць самадзейнымі мастацкімі калектывамі — драматычным, танцавальным ці харавым.

ІХ СПРАВАЗДАЧА — ВЫСТАЎКА

Вучні мінскіх школ, школьнікі з іншых гарадоў з цікавасцю знаёмяцца са справаздачнай выстаўкай навучэнцаў Мінскага мастацкага вучылішча, якая адкрылася ў выставачным павільёне Цэнтральнага дзіцячага парку імя М. Горкага.

На выстаўцы экспануюцца палотны: «Партызаны» В. Жахаўца, «Рыбачкі» Л. Карніенкі, «На пляжы» В. Плуталава, а таксама работы В. Позняка, В. Сакалова, В. Сімакова і іншых. Усяго на выстаўцы экспануецца каля ста работ.

ІГРАЮЦЬ ДЗЕЦІ ШАХЦЁРАЎ

Перад заканчэннем навучальнага года вучні Салігорскай музычнай школы далі некалькі канцэртаў для працоўных горада. Сваё майстэрства яны паказалі рабочым жалезабетоннага завода, будаўнікам абагачальнай фабрыкі, у шырокаэкранным кінатэатры. Вучні М. Карацевіч, А. Бечык, Т. Марціновіч і іншыя з поспехам выконвалі на акардэоне і баяне класічныя і народныя творы.

Я. КРАСОЎСКІ, М. ТАРАСІКАЎ. Пано «БУДАЎНІКІ КАМУНІЗМА».

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

— Над чым вы працуеце, як рыхтуецеся да Рэспубліканскай выстаўкі 1963 года! — з такім пытаннем наша газета звярнулася да мастакоў. Друкуем іх адказы.

З. АЗГУР:

— Да Рэспубліканскай выстаўкі рыхтую партрэты выдатных людзей нашай рэспублікі. Матэрыял — мармур, граніт, калі ўдасца, кераміка.

І. АХРЭМЧЫК:

— У творчасці заўсёды адбіваецца грамадзянская пазіцыя мастака. Гэтая ісціна напоўнілася асаблівым зместам у наш час, калі праведзены такі ясны водападзел паміж сапраўды народным мастацтвам — мастацтвам сацыялістычнага рэалізму і мудрагелістасцю фармалізму.

Шмат ёсць аб чым сказаць мне, старому мастаку, многа хочацца зрабіць. Вось чаму так цяжка было хварэць гэтую восень і зіму. Але цяпер, ачуняўшы, я зноў на нагах, зноў за працаю.

Мяне заўсёды вабіла тэма гераізму савецкага народа. Хачу вярнуцца да палатна аб абароне Брэсцкай крэпасці, але напісаць яго па-новаму, пасля таго як глыбей зразумеў і асэнсаваў веліч подзвігу савецкіх людзей.

Хачу паехаць у калгас, пабываць на пярэднім краі барацьбы нашага народа за далейшы ўздым сельскай гаспадаркі. Зробленыя загатоўкі, магчыма, лягуць у аснову новай работы.

Думаю напісаць партрэты прадстаўнікоў нашай творчай інтэлігенцыі.

А. ГЛЕБАЎ:

— Будаўніка прынята паказваць з цэглай або кельмай у руках. Але справа ў тым, што і цэгла і кельма ўжо даўно не галоўныя на будаўніцтве ды і самі будаўнікі не тыя. Работа, якую я рыхтую да выстаўкі, будзе прысвечана новым людзям на нашых будоўлях. Яшчэ не вырашыў, ці будзе гэтая работа групавой ці статуарнай, але задума ўвогуле ўжо вызначылася. У ліпені — жніўні выязджаю ў Полацк, на Нафтабуд, дзе былі зроблены першыя накіды.

Нядаўна Савецкая краіна адзначала 80-годдзе Сямёна Міхайлавіча Будзённага. Яшчэ летась я зрабіў эскізы коннай статуі народнага героя. Пераходжу да працы ў памеры.

Заканчваю статуі, прысвечаныя нашым фізкультурнікам.

А. ГУГЕЛЬ:

— На выстаўку я прадстаўлю гістарычнае палатно «Уладзімір Ільіч Ленін і Надзежда Канстанцінаўна Крупская».

Гістарычныя работы маюць нібы дзве адзнакі ў часе. Адна звязана з часам, які адлюстроўвае мастак, а другая — з часам, у якім ён працуе.

Карціна «Ул. І. Ленін і Н. К. Крупская» звязана з тым перыядам у жыцці вялікага правадыра, калі ён пасля ранення знаходзіўся на адпачынку ў Горках. А час напісання карціны, іншымі словамі, пункт погляду мастака — нашы дні, калі з новай сілай заззяў для нас вобраз Уладзіміра Ільіча — «самага чалавечнага чалавека» і найвялікшага празарліўца сярод людзей.

Я. ЗАЙЦАЎ:

— Ужо год, як працую над трыпціхам «Мая рэспубліка». Гэты манументальны жывапісны твор патрабуе яшчэ нямала працы.

На выстаўку прадстаўлю партрэты нашых лепшых людзей. Ужо закончыў партрэт Героя Сацыялістычнай Працы Івана Сцяпанавіча Маліноўскага — галоўнага механіка Мінскай цэц № 3. Наступнай работай, напэўна, будзе партрэт ткачыхі.

Абавязкова напішу некалькі індустрыяльных пейзажаў, заводскія ўскраіны сталіцы.

К. КАСМАЧОЎ:

— Працую над графічнай серыяй партрэтаў перадавікоў вытворчасці. Збіраюся пабываць у Полацку, на нафтаперапрацоўчым, дзе працуюць мае героі.

Я. КРАСОЎСКІ:

— У мяне ўсталявалася дружба з даяркамі прыгараднага калгаса імя Гастэлы. Як ні заняты дзяўчаты на ферме, яны заўсёды знаходзяць час, каб папазіраваць для карціны «Сяброўкі», якую я пішу. Вясёлыя і працавітыя, сціплыя і прывабныя — такімі бачацца мне мае гераіні, такімі хочацца перадаць іх на палатне.

Сумесна з мастаком М. Тарасікавым мы закончылі падрыхтоўку эскізаў роспісу фае кінатэатра «Беларусь».

Р. КУДРЭВІЧ:

— Перш-наперш хацелася б назваць тэматычную карціну «Камсамольцы дваццатых гадоў». Працую над ёю другі год. Яна як бы працягвае і дапаўняе мае ранейшыя творы аб моладзі.

Разам з А. Гугелем пішам карціну «Ленін і музыка».

М. ТАРАСІКАЎ:

— Разам з мастаком Я. Красоўскім прыступаем да роспісу фае ў кінатэатры «Беларусь». Тэма роспісу — будаўніцтва камунізма. Роспіс будзе выкананы ў тэхніцы энкаустыкі, якую ў нас яшчэ ніхто не ўжываў. Варыянт роспісу прадстаўляем на выстаўку.

З акна дома, у якім я жыву, адкрываецца цудоўны від на Мінск. Хочацца паказаць гэтую маляўнічую панараму ў нацюрморце з пейзажам.

З КАНЦЭРТАМІ Ў МАСКВУ

У Маскву 8 чэрвеня выехалі Маладзечанскі народны ансамбль песні і танца і Народная харавая капэла калгаса «Сцяг Саветаў» Навагрудскага раёна. На працягу сямі дзён яны дадуць рад канцэртаў на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі і прадпрыемствах сталіцы нашай Радзімы.

Маладзечанскі народны ансамбль песні і танца налічвае 85 удзельнікаў. У выкананні яго хору масквічы пачуюць песні «Жыве з намі Ленін» М. Наско, «Хмарка» П. Чайкоўскага, «Красная Прэсня» В. Мурадэлі, беларускую народную песню «Павей, ветрык, павей», польскую «Марыся».

Харэаграфічная група ансамбля пакажа кампазіцыі «Ой, рана на Івана», «Маладзечанскія гармонікі», беларускія народныя танцы «Лявоніха», «Бульба», рускі народны танец «Камарынская» і іншыя. Народная харавая капэла калгаса «Сцяг Саветаў» уключыла ў сваю праграму «Прывітальную Маскве» П. Шыдлоўскага, рускую народную песню «Колокольчик» у апрацоўцы А. Свешнікава, латышскую «Вей, вей, вецярок», чэшскую «Камышынка» і іншыя творы.

На працягу чэрвеня з канцэртамі на ВДНГ і на прадпрыемствах Масквы выступяць таксама калектыў мастацкай самадзейнасці Гродзенскага Палаца культуры тэкстыльшчыкаў, Брэсцкі народны ансамбль песні і танца, калектыў мастацкай самадзейнасці Палаца культуры прафсаюзаў, народны ансамбль песні і танца Рэчыцкага гарадскога Дома культуры.

БЕЛТА.

АБ ЧЫМ НАГАДАЛА ВЫСТАЎКА

Жыхары Магілёва прывыклі ўжо, што фае абласнога драматычнага тэатра ніколі не пустуе. Пачынаючы з восені мінулага года, тут рэгулярна праводзяцца персанальныя выстаўкі работ мясцовых мастакоў.

Першым паказаў свае эцюды — вынік творчай камандзіроўкі ў Крым — кандыдат у члены Саюза мастакоў БССР Мікалай Федарэнка. За ім — Мікалай Аляксеў работы аб Прыднепроўі. Потым тут выстаўляліся творы Ігара Моніча і Эраста Карповіча.

А зараз мы сталі сведкамі яшчэ адной знамянальнай з'явы, якой не было ў культурным жыцці Магілёва на працягу многіх год,—у фае тэатра адкрылася выстаўка работ юных мастакоў студыі мясцовага Палаца піянераў.

— Лёня Куськін! — усклікае нехта з гледачоў. — Ды гэта ж аднакласнік маёй дачкі. Ён днямі не адрываецца ад паперы і фарбаў...

Імя Лёні Куськіна, нягледзячы на яго чатырнаццацігадовы ўзрост, вядома многім. Малюнкі хлапчука неаднаразова экспанаваліся на рэспубліканскіх выстаўках дзіцячай творчасці, іх можна было бачыць нават у Маскве.

Прадуманасць і нават нейкая сталасць заўважаюцца ў яго работах на гэтай выстаўцы. Лёня не задавальняецца пастаноўкамі гіпсавых злепкаў з антычных скульптур, якімі насычаюць праграму гуртка выяўленчага мастацтва ў магілёўскім Палацы піянераў. Ён прагне большага — адлюстравання свету, убачанага уласнымі вачыма.

Удзельнік выстаўкі Геня Навіцкі, у адрозненне ад Лёні Куськіна, прыгажосць і багацце навакольнага свету імкнецца перадаць праз такі, здавалася б, абмежаваны ў сваіх магчымасцях жанр выяўленчага мастацтва, як нацюрморт. Яго работы «Хлеб», «Гародніна», «Куток кухні» выклікаюць у гледача цёплае пачуццё і павагу да чалавечай працы, да плёну яе.

Я лаўлю сябе на думцы, ці не ванадта захапляюся здольнасцямі пачынаючых мастакоў, ці не занадта ўлюбёна ацэньваю іх першыя творы? Не! Яны варты падтрымкі і ўхвалення.

І таму сёння за адным разам хацелася б сказаць некалькі слоў аб пытанні, якое заслугоўвае асаблівай увагі. Амаль ва ўсіх раённых цэнтрах ёсць у нас школы, дзе дзеці, надзеленыя музычным слыхам, могуць авалодваць музычнай граматай, набываць навыкі ігры на баяне, струнных або духавых інструментах. А чаму ж у раёнах так занядбана справа з выяўленчым мастацтвам? Чаму ёй не надаецца належнай увагі?

Неаднаразова ў рэдакцыю Магілёўскай абласной газеты заходзілі і заходзяць бацькі са сваімі дзецьмі, прыносяць стосы школьных альбомаў з малюнкамі, просяць парады.

Сапраўды, дзе могуць атрымоўваць здатныя да малявання дзеці веды па гэтаму віду мастацтва? У абласным цэнтры існуюць пры Палацы піянераў, пры Доме народнай творчасці студыі выяўленчага мастацтва. А што рабіць хлапчуку ці дзяўчынцы, бацькі якіх жывуць і працуюць у вёсцы на Мсціслаўшчыне ці ў Краснаполлі? Калі б гэтая работа была як след пастаўлена ў кожнай школе, у кожным раённым Палацы піянераў, колькі б можна было выявіць талентаў сярод вясковых дзяцей.

Наспела пытанне і аб арганізацыі ў Магілёўскім краязнаўчым музеі мастацкай галерэі. Раней яна існавала, і фонды яе загінулі ў часе вайны. Як іх аднавіць? Пачынаць можна было б вось з чаго. Калі б наш краязнаўчы музей звярнуўся толькі да мастакоў — ураджэнцаў Магілёўшчыны з просьбай падарыць роднаму гораду па адной-дзве работы, то і тады ў Магілёве была б карцінная галерэя.

Даўно час ужо адкрыць у Магілёве і мастацкі салон. Іменна тут, а не ў фае драматычнага тэатра (куды, не набыўшы білета на спектакль, не трапіш) можна было б праводзіць выстаўкі мясцовых мастакоў і жывапісцаў, якія працуюць у Мінску, Маскве.

Нельга сказаць, што гэтае пытанне не падымалася ў нашым горадзе. Нават і памяшканні пад салон неаднойчы выдзяляў гарсавет, але ў самы апошні момант яны перадаваліся гандлёвым арганізацыям і... зноў абяцанні.

А як усё гэта — салон, галерэя — патрэбны магіляўчанам!

А. КАНДРУСЕВІЧ.

Максім ЛУЖАНІН

МЕСЦА Ў ПАЭТЫЧНЫМ СТРАІ

ПА СТАРОНКАХ ПЕРШЫХ КНІГ

Прамежак паміж першай і другой кніжкамі ўяўляецца мне найбольш адказным, можна сказаць, крытычным часам для маладога аўтара. Розным індывідуальнасцям па-рознаму ўдаецца пераадолець гэты адрэзак дарогі, выкарыстаць як перадышку для новага разгону ці, не даючы сабе спачыну, адразу перайсці да далейшых здзяйсненняў.

За гэты прамежак часу адны паэты ўздымаюцца на вышэйшы ўзровень і замацоўваюць першае выступленне новым, больш удалым.

Другія, карыстаючыся тою магчымасцю, што выпушчаная кніжачка як бы прачыняе ім дзверы ў літаратуру, трымаюцца першай свае каляіны, не пашыраюць і не звужаюць яе, абы патрапіць у той самы след, асабліва, калі ў друку пахвалілі.

Трэція — кідаюць пісанне назусім, калі пераконваюцца, што ўпрагліся не ў свой хамут, ці надоўга замаўкаюць, калі ад патрабавальнасці, несуразмернай з іх магчымасцямі, самі пад корань выбракоўваюць напісанае, не адважваючыся вынесці яго на людскія вочы.

Так было, да прыкладу, з Аркадзем Моркаўкам. Адзіная кніга яго — плод доўгіх ваганняў — выйшла праз шэсць год пасля з'яўлення ў друку першых вершаў паэта. Пасмертная кніга з'явілася аж цераз 30 год пасля першай. А чалавек пісаў усё жыццё!

Больш чым трагічная гісторыя, калі ўлічыць, што А. Моркаўка — зусім выразна выяўлены талент. Меркавалі, змоўк ён, баючыся, каб не раздзяліць лёс сваіх паэтычных аднагодкаў, пацярпеўшых ад культу асобы. Змоўк, загубіў голас і годзе. Аж не! Голас у Моркаўкі і не думаў прападаць. Апынуўшыся ў акупацыі, А. Моркаўка падняў супраць фашысцкіх грабежнікаў чыстае і грознае слова савецкага чалавека. Некалькі спыткаў вершаў яго — ваеннага і перадваеннага часу — былі вельмі прыхільна сустрэты літаратарамі адразу пасля вызвалення Мінска. Гэта ўсё ж не перашкодзіла паэту адмовіцца ад перспектываў выдання і друкавання і схаваць у шуфляду рукапіс, каб выйшлі адтуль пасля ягонай смерці...

Многія хістанні і сумняванні творчай моладзі — маю на ўвазе выключна пытанні росту — былі б менш складанымі і хваравітымі, каб у часе прыкмецілі і развеялі іх, калі не рэальнай дапамогай, дык хоць добрай парадаю і ўвагаю. Трэба больш увагі да першых крокаў пісьменніка. Інакш мы, старэйшыя літаратары, можам апынуцца ў становішчы садавода, які, прапусціўшы тэрміны догляду, сплясквае рукамі і пачынае тужыць, што тое ці іншае дрэўца не дае добрай кроны, а расце ў сук.

Па прыклады хадзіць недалёка. 1958 і 1959 гады былі ўраджайныя на першыя паэтычныя зборнікі і ў пераважнай большасці добрыя. Але адзін толькі Р. Барадулін здолеў выпусціць наступную кніжку на такім узроўні, што аб ёй можна гаварыць без скідкі на малады ўзрост. Гэта значыць, першая кніжка Барадуліна паказала нам аблічча вельмі здольнага паэта, а новая — дала магчымасць яшчэ шырэй меркаваць аб яго магчымасцях.

Не ўсе аўтары выдадзеных у тым часе кніжачак роўна перайшлі да новых творчых выступленняў. У адных былі пэўныя крызісныя ці застойныя з'явы, зрэшты даволі хутка пераадоленыя. У другіх рост замарудзіўся больш значна, другая кніжка аказалася слабейшай, з радкоў пачало патыхаць растрачанай маладосцю, слязлівым захапленнем мінуўшчынай, кепскім пазёрствам. Такім чынам, магчымасці выступіць з новай кнігай для такіх аўтараў вельмі абмаліліся.

Вось чаму, не ўскладаючы на сустрэчы і размовы з аўтарамі першых кніг спадзяванняў месіянскіх, такія гутаркі ўсё ж трэба весці. Яны павінны даць вынікі, хоць бы ў сэнсе збліжэння і выяўлення паэтычных інтарэсаў, у сэнсе разумення задач творчых і грамадзянскіх.

Вялікая ўвага партыі, патрабавальнасць народа да сваёй літаратуры — вось чым характэрны час, у які мы ўступілі. Працаваць з найбольшай адказнасцю, а значыць, і з найбольшым плёнам заклікае партыя сваіх верных памочнікаў — пісьменнікаў. Самым непасрэдным чынам адносіцца гэты заклік і да тых, хто сягоння спрабуе пяро ці толькі мерыцца выскубці яго з гусінага крыла, гаворыць пакуль не на ўсю сілу, каб неўзабаве аказацца голасам поўным і непаўторным.

Скідкі на першую кнігу даём толькі мы самі сабе ды найбольш лагодныя з нашых крытыкаў. Чытачу ж не абыходзіць, якая па ліку кніжка выпускаецца — першая ці апошняя, — яму трэба толькі добрая. І ўсё ж першая кніга — падзея немалаважная і для паэта, і для чытача.

Прыгадайце назвы першых кніг лепшых майстроў беларускай паэзіі. «Вянок» — адразу выклікае ў памяці імя Максіма Багдановіча, «Завіруха» — Міхася Чарота, «На этапах» — Максіма Танка. Ужо ў саміх назвах ускрываецца змест кніг і нарадзіўшага іх часу. «Завіруха» пераносіць у першыя гады рэвалюцыі, калі рэвалюцыйны пераварот параўноўваўся са стыхіяй, кожны дзень нёс нечуваныя змены, жыццё набывала нябачаны тэмп і размах. «На этапах» азначае не толькі вандроўкі маладога падпольшчыка ад яўкі да яўкі, ад турмы да турмы, а і пераход краін і народаў з аднаго гістарычнага кругабегу ў другі. «Вянок» цярпліва сабраны і сплецены з розных кветак і зялёных лістоў, што раслі на роднай глебе, дзе не ўдалося выхавацца і жыць самому паэту, бо каб было так, дык іншае, азначаўшае непарыўную сувязь з радзімай, слова павінна было б назваць кнігу. Апрача таго, у назву быў закладзен намёк на дасканаласць формы (кола), на завершанасць пабудовы кнігі. Нарэшце, назву дыктавала і прадчуванне недалёкай смерці, калі на магільны курганок прынясуць апошнія знакі ўвагі і павагі да нябожчыка — вянкі. Унутрана пратэстуючы супраць непатрэбнасці жорсткага звычаю, паэт паклапаціўся сам пакінуць пасля сябе вечна зялёны вянок паэзіі.

Багдановічаўскі «Вянок» здаецца неперасягнутым узорам цэльнасці лірычнай кнігі. Кніга чытаецца так, як быццам мае яна своеасаблівы лірычны сюжэт. З кожным новым вершам паэт усё глыбей і паўней раскрывае свет, змешчаны ў сабе, свет, які абкружае яго рэальна, і свет, што існуе толькі ва ўяўленні. Паспрабуйце чытаць «Вянок», прапускаючы старонкі: адразу ж заўважыцца ненатуральнасць пераходу ад верша да верша, як быццам сапраўды адбыўся разрыў сюжэтнай тканіны. Складанне кнігі вершаў, кнігі, а не зборніка, пачынаецца з назвы, з адбору і затым з устанаўлення такога чаргавання адабраных рэчаў, калі парадак іх нічым не можа быць парушаны. Вершы, будучы ўключаны ў кнігу, атрымаўшы пэўнае месца ў ёй, робяцца як бы часткамі загадзя задуманага цыкла, хоць напісаны ў розныя часы з неаднолькавай задачай і настроем. Вось чаму ў патрабавальных аўтараў асобныя вершы гадамі чакаюць магчымасці заняць месца ў кнізе.

Калі з такімі крытэрыямі меркаваць аб прачытаных мною першых зборнічках паэзіі [1], дык яны выклічуць не толькі заўвагі датычна зместу і настрою, а і пярэчанні наконт назваў і кампаноўкі вершаў.

Тэндэнцыі развіцця асобных паэтаў, перспектыва іх росту, адчуванне імі часу, кола грамадскіх інтарэсаў і праблем, якія іх цікавяць, умельства расказаць аб тым, што задумана, і, нарэшце, умельства злажыць з гатовых рэчаў кнігу — вось аб чым хочацца пачаць размову.

Паэтычная біяграфія новага пакалення людзей, да якога адносяцца і самі нашы маладыя таварышы, правільна, на мой погляд, вызначаецца наступным радком: «Камсамольцы сярэдзіны веку» (М. Рудкоўскі) — гэта значыць, людзі, што могуць сказаць: «Мы за цябе яшчэ не паміралі, мы за цябе, Радзіма, будзем жыць» (В. Вярба). Гэта пакаленне, ахопленае прагаю пераўтварыць прыроду, дарабіць нядзейсненае бацькамі, «пустыя калодзежы вадой напоўніць», «асфальтам вуліцу напаіць» (А. Наўроцкі).

Зусім натуральна, што па сваіх імкненнях і практычных дзеяннях гэтая моладзь адрозніваецца ад камсамольцаў часу грамадзянскай вайны, ад маладых энтузіястаў працоўнага подзвігу ў 30-х гадах, ад гераічнай самаадданай моладзі, якая праславіла сябе ў Вялікую Айчынную вайну. Аднак у прыродзе сваёй, у галоўным, новае пакаленне не зазнала змен. Усё такое ж яно ў высакароднасці пачуццяў, у працоўным энтузіязме, у высокай самаадданасці, у гатоўнасці ахвяраваць сваім уласным, а значыць, малым, у імя агульнага, грамадскага, а значыць, незраўнана вялікага.

Пра ўсё гэта і расказваюць амаль усе названыя мною аўтары, праўда, з рознай глыбінёй пранікнення ў сутнасць з'яў, з рознымі магчымасцямі гавораць выразна і дакладна, з розным умельствам прыкмячаць і назіраць, адрозніваць у рэчаіснасці асноўнае ад выпадковага.

Ніхто не збіраецца выдаваць творчай моладзі патэнты на званне летапісцаў сучаснасці, не будзе тут індульгенцый на грахі маладосці, як не будзе жорсткага раскрыжавання за гэтыя грахі. Шмат на якіх вершах маладых маіх таварышаў ляжыць адбітак паспешлівасці, вучнёўства, якое мінаецца без асаблівых прыдзірак у перыёдыцы, але заўсёды прыкра назаляе ў кнігах. У кніжках, якія я пералічваў тут, мала яшчэ завершаных, да канца апрацаваных і ўзважаных рэчаў. Затое хоць адбаўляй цацак, бразготак, пустышак, якімі забаўляюць дзяцей, абы не плакалі. Ёсць вершы, што з'явіліся без задумы, трапляюцца выпадкі, калі задумы не выраслі ў вершы, калі ніштаватыя рэчы псуюцца давескамі-канцоўкамі, дыдактычнымі ці рытарычнымі, дробнымі па думцы і няўдалымі па выражэнню. Часамі добрая плынь верша каламуціцца грубымі моўнымі агрэхамі, какафанічнымі збегамі, у выніку якіх утвараюцца непажаданыя сэнсавыя адзінкі, непрыдатныя для вымаўлення ўголас.

Аднак радуе верш за ўсё светлае ўспрыманне жыцця і веданне свайго месца ў нашым стваральным дні. Гэта становіча якасць выгодна вылучае работу пераважнай большасці аўтараў. Амаль зусім не заўважаецца стану, вельмі непрыемнага і небяспечнага для маладых паэтаў, калі малады чалавек, хай можа і здольны, настолькі засяроджваецца ў сабе, што, як некаторыя паслядоўнікі ўсходніх багоў, задавольваецца выключна разгляданнем уласнага пупа, прымаючы гэты пункт за цэнтр свету і адзіны крытэрый для ацэнкі людзей і рэчаў. Тым часам, агульнавядома, што асабістае, не будучы суаднесена да грамадскага, агульнага, не можа ўздзейнічаць на пачуцці і перастае існаваць.

Месца сваё і свайго пакалення ў нашым стваральным жыцці асэнсоўваецца маладымі паэтамі сур'ёзна і цвяроза. Іх аднагодак «нікім не быў героем, за жыццём было цяжка ўгнацца». Радкі, можа, не вельмі зграбныя, але адметныя па думцы. Малады чалавек выразна разумее, што стваральны размах, дасягнуты бацькамі, абавязвае сыноў да больших намаганняў, тады яны знойдуць сваё месца, зробяць сваю працу прыкметнай.

Вершы Д. Бічэль, на мой погляд, не маглі быць не напісаны. Жывое пачуццё патрабавала пераходу ў такі стан, каб быць перададзеным сябрам і сяброўкам, знаёмым і незнаёмым, каб быць зразуметым імі. На дапамогу прыйшло слова, такім чынам пачуццё выказалася. У гэтай непасрэднасці выказвання, у немагчымасці стрымаць слова — галоўная вартасць вершаў Д. Бічэль. Яны простыя, як усё, што абкружае паэтэсу, пра што яна піша: Нёман, Гродна, кола сяброў, родная мова. Паэзію Д. Бічэль цяжка ўявіць па-за роднымі з'явамі і мясцінамі, дзе песня ўкладаецца «ў цымбалы шляхоў — правады», дзе «ноч, як воўк, уцякае з дарог» і дзе звычайна мантцёр выглядае як «электрычны чубаты бог». Мы ахвотна верым паэтэсе, што ў вёсцы Біскупцы так добра, так хораша, што «Нёман тут не цячэ, здаецца, а танцуе між берагоў». І бывае крыўдна, калі паэтэса забываецца на ўласцівае ёй слова, яснае ўспрыманне свету і піша штосьці банальнае і невыразнае: «Абарваўся ў пачатку той гімн, бо зябрэў яго шчасце другі». Адкуль гэтыя драўляныя, чужыя паэтэсе радкі? Часамі яна не можа супрацьстаяць магутнай стыхіі купалаўскіх інтанацый («А ні груш, а ні сліў»...) Праўда, не так лёгка гэта зрабіць, але нават і ў гэтым вершы паэтэса самастойна думае і выходзіць удалае і вострае заканчэнне.

Удала і трапна гаворыць гераіня, адмаўляючыся выходзіць замуж за хлопца,

Покуль носіш гультая
У блішчастым боце.

Новыя нядаўнія вершы — вельмі сур'ёзны зрух у поступе Д. Бічэль. Гэта кароткія прыгаворкі з усмешкай, з добрай цеплынёй, наскрозь празрыстыя. Нейкімі далёкімі продкамі іх з'яўляюцца замовы, гэты першабытны від паэзіі. Ці трэба гаварыць, што па характары сваім яны сучасныя і даволі ўдала перадаюць аблічча нашай сучасніцы, тое, што яна адчувае, пра што думае.

Не лішне будзе ўспамянуць добрым словам рэдактара «Дзявочага сэрца». Анатоль Вялюгін далікатна, але сурова выканаў свае абавязкі і як спрактыкаваны таварыш параіў паэтэсе вызваліцца ад слабога, зрабіць дзе трэба мацнейшыя акцэнты, давесці да выразнасці радок, а то і верш. Такая ж рэдактарская дбайнасць вылучае паміж іншых кніжкі В. Вярбы і Г. Бураўкіна.

У «Вачах вясны» В. Вярба як быццам абмяжоўвае сваю задачу чатырохвершам на вокладцы, выказваючы жаданне, каб каханне яе свяціла наступнікам «маленькай зоркай з сіняй вышыні». Уцешна, што магчымасці паэтэсы шырэйшыя за дэкларацыю: у зборніку чуваць сапраўдная любоў да Радзімы, клопат аб міры, аб будучым чалавецтва.

Пакуль што ў В. Вярбы менш свайго, чым наноснага. Сустракаюцца назвы вершаў і бадай дакладныя цытаты з В. Інбер («Верыш ты, куды б ні йшла я па сваёй зямлі»). Часамі паэтэса бярэ на сябе мужчынскія функцыі («Надзівіцца з вачэй марсіянак») і гэта гучыць камічна.

Найбольш цэльны і непасрэдны верш «Сны» з маляўнічым і дакладным пачаткам:

Горад заснежаны
гасіць агеньчыкі,
Нібы хто ў рэчку
шпурляе каменьчыкі.
Тоне каменьчык —
гасне агеньчык.
Самкнуцца кругі —
гасне другі.

Слабей верш «Лялька», сапсаваны бязгусціцай («Да цябе прыйдуць новыя губы» і «ром Бакардзі»), недадуманы канчаткова, недапісаны.

Пакуль што цяжка меркаваць і аб галоўнай тэме паэтэсы і аб вызначэнні ўласнага почырку. В. Вярба вельмі лёгка перакідаецца ад банальнай рамансавай інтанацыі («За адну сябе кахаю, а пакуты за дваіх») да распрацаванага Маякоўскім і Багрыцкім гутарковага верша («Сны»). Ёсць пераскокі да прыпевачнага — народнага і «паднароднага» («Ручнікі»).

Больш сур'ёзна можна размаўляць з В. Вярбой як з аўтарам лірычнага цыкла «Снежань маладосці» («Полымя», 1963, № 3). Першы папрок рэдактару: чаму ж было не выкрасліць уступны раздзельчык, несамастойны, без акрэсленай думкі і зусім непатрэбны для далейшага. У рэчы ёсць налёт задавання багемай (дарэчы, хлапечага), запазычаны з паэзіі 30-х гадоў («недапетыя песні», «недапітае віно», «белае віно»), і залішняя, каб быць паэзіяй, адкрытасць («Мне рукі цалаваў мужчына, якому цэлы свет дала ўзамен»).

Але ўслухаемся ў своеасаблівую музыку верша, адчуем веснавы настрой ад свежасці снежня, маладосці, першага снегу. Многа аб чым знайшлося расказаць паэтэсе, падышоўшы да жыцця, увайшоўшы ў яго. Размова са сваімі выхаванцамі (2-гі раздзел) блізка стаіць да сталасці мыслення і сталасці паэтычнай з добрым размахам уяўлення:

Я гляджу на галоўкі русыя,
Што схіліліся па-над партамі,
Нарадзіліся вы беларусамі,
Каб складаць марсіянскія карты.

Думаецца, што «Снежань маладосці» — гэта выхад на сцяжыну, торачы якую, В. Вярба знойдзе паэтычную ўдачу. Толькі паменш бы надворных эфектаў, хай будзе цішэйшы і менш бліскучы верш, але затое праўда, не фальш і не падманка.

Ці мала цікавага для размовы даюць кнігі Г. Бураўкіна, В. Макарэвіча, А. Наўроцкага. «Майская просінь» Г. Бураўкіна спыніла ўвагу чытача не тымі не зусім самастойнымі і крыху задавацкімі радкамі («Я іду дваццацігадовы, і дзяўчаты глядзяць на мяне»), а перш за ўсё маладым адчуваннем жыцця, радасцю ад паўнаты ўспрымання, упэўненасцю ў сваіх магчымасцях зрабіць добрае:

Паглядзяць на мяне сустрэчныя
І таксама шчаслівымі робяцца.

У Г. Бураўкіна даволі шырокі грамадскі дыяпазон і кола інтарэсаў. Ён умее хутка адгукацца на падзею, многія радкі яго прысвечаны Леніну, партыі, Кастрычніку, моладзі. Праўда, гэта шырыня пакуль выяўляецца больш тэматычна, чым у паэтычным раскрыцці: не ўсё задуманае сказалася як належыць.

Не зусім сціпла атрымліваецца, калі аўтар, чалавек нараджэння 1936 года, гаворыць аб Кастрычніцкай рэвалюцыі як яе ўдзельнік («Мы сваёю рукой адмыралі з панскіх гоняў сабе па крысе»).

Другая кніжка — шырэйшая па ахопу з'яў і падзей, значна сталейшая па вырашэнню тэм, ёсць бясспрэчны поступ і ў майстэрстве. Лепшае ў ёй — вершы з фестывалю, асабліва «Бежанцы ў Хельсінкі» і «Рукі фестывалю». Цёпла ўспрымаюцца «Першыя з дынастыі» пра маленькіх нафтавікоў і крыху сумнаватыя, разважлівыя, але светлыя і разумныя верш «Гэта цяжка, таварыш, разам кашу варыць...»

Сказаць па праўдзе, хоць умельства варыць паэтычную кашу ў Г. Бураўкіна і прыбыло, але і ў другую кніжку перавандравала шмат чаго непажаданага з першай. Доўгая і недакладная назва! «З любоўю і нянавісцю зямною», як быццам нам вядомы касмічныя ці нябесныя нянавісці. Невыразна гучыць зварот да ўласнага слова (дэкларацыя над партрэтам): «Зайдзі ў душу і застанься там назаўсёды». Як быццам паэтава слова не змяшчаецца ў яго істоце і не выходзіць з яе. Хапае моўных неахайнасцей, недапрацовак («Збяры ўсё гэта і на плечы песні сваёй вазьмі. І нясі яе...»), ёсць недапушчальны сэнсавы збег у вершы, якім адкрываецца кніга.

(Заканчэнне на 4-й стар.).

[1] Д. Бічэль, «Дзявочае сэрца», В. Вярба, «Вочы вясны», Г. Бураўкін, «Майская просінь» і «З любоўю і нянавісцю зямною». Г. Кляўко, «Абветраныя далягляды». Ул. Карызна, «Край мой сінявокі». Ул. Ляпешкін, «Ранішнія росы». А. Наўроцкі, «Неба ўсміхаецца маланкаю», В. Макарэвіч, «Вогненная камета», М. Рудкоўскі, «Першыя вёрсты».

У аснову артыкула пакладзена ўступнае слова на пасяджэнні секцыі паэзіі Саюза пісьменнікаў БССР 5 чэрвеня 1963 г.

Пры Палацы культуры завода «Гомсельмаш» створаны гурток баяністаў. У ім займаецца каля 20 чалавек. Гурток вядзе камсамолка, студэнтка Гомельскага музычнага вучылішча Людміла Мазурэнка. Зваршчык А. Школьнік уважліва слухае свайго маладога педагога.

Фота М. ХУДАЛЕЕВА.

ЧАЛАВЕК З КІНАКАМЕРАЙ

ДАСЛЕДЧЫК ЖЫЦЦЯ, ПУБЛІЦЫСТ

За сталом, поўным кніг, сядзіць чалавек з сівымі скронямі, але дзіўна маладым і добрым позіркам. Загарэлыя і жылістыя рукі ўскрываюць канверт.

«Дарагі Пётр Пракопавіч! Пішам Вам, што справы нашы ідуць добра. Падвялі вынікі чвэрці. Ацэнкі — добрыя...»

П. Шамшур за праглядам адзнятай кінаплёнкі.

Сардэчная і шчырая дружба кінарэжысёра Пятра Пракопавіча Шамшура з навучэнцамі Пружанскай школы-інтэрната завязалася некалькі год назад, калі ў Пружаны прыехала здымачная група кінахронікі. Дзецям спачатку, вядома, самым цікавым было тое, што іх здымалі ў кіно. А потым — захапляючыя гутаркі з Пятром Пракопавічам. Быццам ажывалі старонкі падручніка. З далёкіх гадоў набліжаліся падзеі суровага і трывожнага юнацтва камсамола...

Цікавае і багатае жыццё ў Пятра Пракопавіча. 18-гадовым юнаком прыйшоў ён у рады 5-й Чырвонасцяжнай арміі, авеянай моцнымі рэвалюцыйнымі традыцыямі. Тут Пётр Пракопавіч гартаваўся пад уплывам старых ветэранаў ленінскай гвардыі, тут вучыўся па-бальшавіцку жыць. І цяпер, успамінаючы дні свайго юнацтва, Пётр Пракопавіч называе 5-ю Чырванасцяжную вялікай школай жыцця, праўды, стойкасці.

Пасля дэмабілізацыі Пётр Пракопавіч — камсамольскі важак у Мінску. Бадай, біяграфія нашай краіны тых год была і біяграфіяй Пятра Пракопавіча. Разам са сваімі паплечнікамі ён рос, вучыўся, тварыў. Змагаўся за новае жыццё. Камсамолец Шамшур быў слесарам, камандзірам камсамольскага палка, фельетаністам і сакратаром райкома камсамола, аўтарам першых прадстаўленняў тэатра рабочай моладзі (ТРАМ).

У 1932 годзе П. П. Шамшур па пуцёўцы ЦК Кампартыі Беларусі прыходзіць у кіно. Нялёгкі быў час. Беларускае кіно рабіла свае першыя крокі.

Шчырае імкненне П. Шамшура ісці заўсёды ў нагу з часам, заўважаць галоўнае, важнае, гаварыць аб тым, што хвалюе душу і розум сучасніка, хутка выдзяляюць юнака сярод калектыву кінаработнікаў, і ён становіцца сарэжысёрам новых кінафільмаў. А камуністы студыі выбіраюць яго парторгам.

У напружаных творчых буднях праходзяць гады. Пётр Пракопавіч вучыўся ў такіх майстроў, як Ю. В. Тарыч а потым і сам вучыў, выхоўваў кадры маладой нацыянальнай кінематаграфіі.

Калі ў нашай краіне пачаўся рух за камуністычную працу, П. П. Шамшур першы на беларускай студыі дакументальнага кіно адгукнуўся на гэтую тэму стварэннем фільма аб разведчыках светлай будучыні — рабочых Мінскага завода запасных частак.

Разнастайныя інтарэсы кінарэжысёра Пятра Пракопавіча Шамшура. Яго хвалюе і жыццё школы-інтэрната, і поспех калгаснікаў-жывёлаводаў і аблічча новага Мінска — сталіцы нашай рэспублікі.

Сучасны Мінск!

Пётр Пракопавіч добра памятае вузкія вулачкі, славутую конку, Мінск першых суботнікаў і першых новабудоўляў. Вывучэнне розных архіваў, шматлікіх дакументаў і фатаграфій, успамінаў мінулага і пільнае назіранне сучаснага жыцця падказалі мастаку тэму: карціна пра родны Мінск. Плённай была гэта праца. Дакументальны фільм «Старонкі гісторыі Мінска» хвалюе сваёй непасрэднасцю, шчырасцю і паэтычным позіркам на нашу сталіцу.

А ў гэты час ужо новыя творчыя думкі завалодалі працавітым кінадакументалістам. Мастак, улюбёны ў нашу рэчаіснасць, жыва адгукаецца на розныя з'явы часу.

«Школа прыгожага» — паэтычны рэпартаж пра Гомельскі універсітэт культуры і мастацтва, дзе аўтар паказаў вобразы простых савецкіх людзей, для якіх жыццё, праца і мастацтва сталі непадзельнымі. І калі пра гэтую рысу нашых будняў Пётр Пракопавіч гаворыць з цёплым лірызмам, то пра цемрашалаў-царкоўнікаў ён расказвае ў сваіх двух наступных строга дакументальных фільмах гнеўна, публіцыстычна. Антырэлігійныя фільмы «Ад цемры да святла» і «Праўда пра святыя месцы» абышлі экраны ўсёй краіны і нямала дапамаглі нашай атэістычнай прапагандзе.

У творчасці П. Шамшура спалучаюцца ўважлівы позірк журналіста, здольнасці гісторыка-даследчыка і вопытнага кінадакументаліста. Менавіта гэтыя якасці вылучаюць яго абвінаваўчую карціну «Людзі з чорнымі душамі». Больш года старанай працы прынеслі добрыя вынікі. Дакументальна, неабвержна паўстала перад намі здрадніцкая дзейнасць кучкі беларускіх нацыяналістаў, прыслужнікаў і лакеяў фашызму. Гэты фільм — грозная перасцярога «гаспадарам» з-за мяжы, што яшчэ і цяпер зарацца на нашу зямлю.

Наступны фільм П. Шамшура прысвечаны жыццю і вялікай грамадскай дзейнасці слаўнага сына беларускага народа Якуба Коласа.

Зараз Пётр Пракопавіч заканчвае яшчэ адзін гістарычны фільм. Гэта будзе аповесць пра К. Каліноўскага.

...Сівізна кранула скроні П. Шамшура. Днямі яму спаўняецца шэсцьдзесят год. Але час не ўладарны над яго запалам, энергіяй. У Пятра Пракопавіча шмат новых планаў. Ад шчырага сэрца жадаем яму новых поспехаў і доўгіх год жыцця на карысць нашай Радзімы.

Р. ЯСІНСКІ.

У Брэсце пабывала група пісьменнікаў Беларусі, Украіны і Далёкага Усходу. Яны сустракаліся з рабочымі прадпрыемстваў горада, з пагранічнікамі, азнаёміліся з Белавежскай пушчай, агледзелі музей у Брэсцкай крэпасці.

На здымку: беларускі пісьменнік Алесь Махнач расказвае гасцям пра баі на тэрыторыі крэпасці.

Фота В. ГЕРМАНА. (БЕЛТА).

ЛЯЛЬКІ ДАЮЦЬ ІНТЭРВ'Ю

Мы пайшлі ў Мінскі тэатр лялек, каб узяць невялікае інтэрв'ю. Быў абедзенны перапынак. Кабінет дырэктара аказаўся зачынены, і мы вырашылі зазірнуць у майстэрню. Там таксама нікога не было. На сталах і стэлажах ляжалі і віселі лялькі. Яны глядзелі на нас сваімі цікаўнымі гузікавымі вачыма, нібы чакаючы пытання.

— Добры дзень! — міжволі вырвалася ў нас.

— Добры дзень! — адказалі яны.

Мы настолькі збянтэжыліся, што спыталі:

— Хто вы такія?

— Зайкі, — адказалі яны і ў сваю чаргу спыталі:

— А вы хто?

— Мы... Мы... дзядзькі... з рэдакцыі... — прамармыталі мы.

Але зайкі зрабілі выгляд, што не заўважылі нашай збянтэжанасці, і даверліва пахваліліся:

— А мы новенькія! Нас толькі што зрабілі!

— Што ж вы будзеце іграць? — пацікавіліся мы.

— О, — адказалі зайкі, — гэта новая п'еса Пеньча Маньчава «Заечая школа». Яна перакладзена з балгарскай. На другім Сусветным фестывалі лялечных тэатраў у Бухарэсце ёй прысудзілі Залаты медаль.

— А што адбываецца ў п'есе? — спыталі мы.

— Усё, што ў сапраўдным жыцці ва ўсіх дзяцей: зборы ў школу, урокі, гульні, праца за варштатам і на школьным участку. Мы нават хітрую Лісу перамагаем! — з гонарам дадае самы маленькі Зайка.

— А дзе лялькі з іншых спектакляў? — цікавімся мы.

— Мы не ведаем... — бездапаможна разводзяць лапкамі зайкі.—Мы ж новенькія, толькі што зробленыя, і нічога, апроч сваёй п'есы, не ведаем, — апраўдваюцца яны.

— Не ведаем... — перадражнівае іх хтосьці за заслонаю. — А я вось ведаю!

Мы адкрываем заслону і бачым Нязнайку. У яго забінтавана галава.

— Не звяртайце ўвагі, — гаворыць Нязнайка, — гэта я ў рамонце. Вас цікавіць, дзе іншыя лялькі? Што ж, хоць я і завуся Нязнайкам, але адкажу вам дакладна: «Зялёная Лісіца» ў Гродна.

— Зялёная лісіца... Хіба лісіцы бываюць зялёныя? — смяецца маленькі Зайка.

— Бываюць! Залезь у бочку з зялёнай фарбай — і ты сам станеш зялёны. Цікавая п'еса! — захапляецца Нязнайка. — Усе звяры ў лесе пачалі баяцца Зялёнай Лісіцы, думалі, што паявіўся кракадзіл. А потым здагадаліся, што гэта лісіца, заманілі яе да рэчкі, піхнулі ў ваду — яна пакупалася і зноў стала рыжая!

— А дзе лялькі са спектакля «Вясёлы цырк»? — спыталі мы.

— У Літве. Яны выступалі ў Вільнюсе, Каўнасе, едуць у Клайпеду, — адказаў усёзнайка-Нязнайка.

Мы падзякавалі Нязнайку і зайкам і звязаліся па тэлефоне з Клайпедай.

— Ало! Клайпеда? Запрасіце да тэлефона лялек «Вясёлага цырка». Хто ля тэлефона? Бобік? Добры дзень, Бобік! Гавораць з рэдакцыі. Нас цікавіць, як прымаюць гледачы ваш спектакль у Літве. Вельмі добра? Дзякуем. Да пабачэння!

Мы засталіся задаволеныя сваім інтэрв'ю з лялькамі. Асабліва прыемным аказалася тое, што мы не сустрэлі ні Лесуна, ні Бабы Ягі, нам не траплялі на вочы такія мала прыемныя рэчы казачнага ўжытку, як ступа з таўкачом, лапці, царскія кароны і баярскія кіі. Мы пазнаёміліся з лялькамі, якія сучасныя нам па вонкавым абліччы, сваіх учынках, мове, рысах характару. І гэта ўзрадавала нас.

Поспехаў вам, лялькі!

А. ЛЯЛЬКЕВІЧ.

— А мы новенькія! Нас толькі што зрабілі!

— Я ў рамонце.

ДА СУСВЕТНАГА КАНГРЭСА ЖАНЧЫН

У ста краінах ужо сфарміраваны дэлегацыі на Сусветны кангрэс жанчын, які павінен адбыцца ў Маскве, — паведаміла 7 чэрвеня на прэс-канферэнцыі для замежных і савецкіх журналістаў старшыня Камітэта савецкіх жанчын Н. Папова, якая з'яўляецца віцэ-старшынёй Міжнароднай дэмакратычнай федэрацыі жанчын.

У саставе гэтых дэлегацый — актыўныя дзеячы жаночага руху. Сярод дэлегатак ад Японіі, напрыклад, — прадстаўніцы 20 арганізацый. Члены розных жаночых арганізацый будуць у дэлегацыях ЗША, Англіі, Францыі і іншых дзяржаў.

Шырокая падрыхтоўка разгарнулася да кангрэса ва ўсіх раёнах Савецкага Саюза. Калектывы многіх прамысловых прадпрыемстваў Масквы, Ленінграда, Кіева і іншых гарадоў нясуць працоўную вахту ў гонар кангрэса. Рабочыя, калгаснікі, вучоныя, літаратары, музыканты, грамадзкія дзеячы ўносяць у «Фонд міру», сродкі з якога выдзяляюцца на патрэбы кангрэса, свае працоўныя зберажэнні, ганарары, прэміі. Жыхары Находкі, Брэста, Унгена, Адэсы, якія першымі сустрэнуць зарубежных гасцей, стварылі спецыяльныя групы і камітэты гасцінасці. Савецкія жанчыны рыхтуюць розныя сувеніры і падарункі. Некаторыя з іх былі паказаны на прэс-канферэнцыі.

Адказваючы на пытанні карэспандэнтаў, Н. Папова паведаміла ў прыватнасці, што адкрыццё і закрыццё кангрэса намечана правесці ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў.

Для шырокіх дыскусій і сустрэч удзельніц кангрэса па праблемах адводзяцца Вялікі Крамлёўскі палац, Калонная зала Дома Саюзаў, Дом дружбы з народамі зарубежных краін. Афіцыйнымі на кангрэсе будуць сем моў — руская, французская, англійская, нямецкая, іспанская, кітайская і арабская. Магчыма, некаторыя дэлегаткі прыедуць у Маскву з дзецьмі. Работніцы камбіната «Трахгорная мануфактура», завода імя Ліхачова і раду іншых маскоўскіх прадпрыемстваў выказалі гатоўнасць прыняць гэтых дзяцей у сваіх яслях і дзіцячых садах.

У заключэнне Н. Папова выказала ўпэўненасць, што Сусветны кангрэс жанчын узніме на новую ступень міжнародны жаночы рух у барацьбе за мір, нацыянальную незалежнасць, за правы жанчын і шчасце дзяцей. ★

Малюнак Алены ЛОСЬ.

НАША ПРАВА, НАШ АБАВЯЗАК

24 чэрвеня ў сталіцы нашай Радзімы Маскве пачне сваю работу Сусветны кангрэс жанчын.

Вакол дома, у якім я жыву, сапраўднае дзіцячае царства. Звыш дзесяці дзіцячых садоў і ясляў і тры вялікія цудоўныя школы пабудаваны ў гэтым самым буйным мікраёне нашай сталіцы, па вуліцы Волгаградскай. І зранку да вечара тут кіпіць вясёлае гаманлівае жыццё.

Вось выйшлі на спартыўную пляцоўку вучні 63 школы. Пад сонечным небам ідзе ўрок фізкультуры. Я любуюся стройнымі постацямі хлопчыкаў і дзяўчынак у блакітных футболках, якія пад каманду настаўніка выконваюць гімнастычнае практыкаванне. Колькі сярод гэтых юных гімнастаў будучых вучоных, лётчыкаў, інжынераў, музыкантаў, сталяраў! І ўсе яны будуць жыць пры камунізме, тварыць і будаваць у светлай будучыні чалавецтва.

А вось і дзіцячая пляцоўка. Малыя будуюць з пяску гарадок, гуляюць у ката і мышку, паліваюць кветкі.

— Я, калі вырасту, буду Гагарыным і палячу на Месяц, — рашуча абвяшчае сваім сябрам загарэлы сінявокі хлопчык у белай панамцы.

— А я буду мараком, — гаворыць яго сусед.

— А я, як тата, буду шафёрам, — дадае трэці.

Я вырасту, я палячу, я пабудую... Дзеці мараць аб сваёй шчаслівай яснай будучыні, аб міры на зямлі.

І каб мірнае сонца вечна ззяла над імі, каб стаяў зранку да вечара на дзіцячых пляцоўках гэты шчаслівы гоман і смех, мы павінны бараніць іх шчаслівую, ясную будучыню, тварыць і працаваць у імя яе, не пакладаючы рук, да апошняга ўдару свайго сэрца.

Я. БЯГАНСКАЯ.

Вось ён, беларускі шоўк.
Фотаэцюд Т. Ананьінай.

Гэтая старонка падрыхтавана па ініцыятыве паэтэсы Эдзі Агняцвет. Гакарар за творы, змешчаныя на старонцы, аўтары перадаюць у фонд Сусветнага кангрэса жанчын, які адкрываецца 24 чэрвеня ў Маскве.

Канстанцыя БУЙЛА

КАБ СОНЦА ЗЗЯЛА НАД СВЕТАМ

Маці-работніца! Маці-калгасніца!
Добра жывуць вашы дзеці.
Сонейка шчасця над імі не гасіцца,
Ласкава, шчодра ім свеціць.
Дзеткі растуць —
наша радасць сардэчная,
Кветкі цудоўнага саду.
Мы ім прынеслі свабоду навечна,
Нашу вялікую праўду.
Ім аддадзім нашы мары высокія,
Нашым нашчадкам цудоўным.
Хай жа ідуць у жыццё — яснавокія —
Шляхам вясновым, працоўным.
Сёстры работніцы! Сёстры сялянкі!
Войнам аб'явім вета,
Каб не тапталі кветак танкі,
Каб сонца ззяла над светам.

Еўдакія ЛОСЬ

МІР

Мір — гэта ранак зялёны,
Сонца на парастку кожным.
Мір — гэта маці, дзіцёнак,
Радасць на твары прыгожым.

Мір — гэта дзень за станкамі,
За чарцяжамі шматкутнымі,
За шчырымі тымі радкамі,
Што часам здаюцца пакутнымі...

Мір — калі ўсе пуцявіны
Водарам лета дурманяць.
Мір — калі толькі ўспаміны
Вочы слязамі туманяць...

* * *

Мы ідзём на работу ўтраіх:
Ты, ды я, ды малое наша...
Мы ідзём каля клёнаў старых,
Каля рэчкі, дзе свежая паша.

Мы ідзём — у руцэ рука,
Пыл вільготны казыча ногі.
Клён і ў ранішнім дыме рака
Зычаць добрае нам дарогі.

Разумее прырода нас,
І лістотаю пляскае вецер,
Як заплешча праз нейкі час
У ружовыя ладкі трэці...

СЯБРОЎКІ

Усе мы крышачку дзіўныя,
Смешныя, паэтэсы...
Нервы ў нас «крапіўныя»,
Вострыя інтарэсы.
А галасы такія,
Што возьмуць песню і оду,
Закінуць у душы людскія,
Дадуць асалоду.
У песні нашай прычына
Ёсць, каб шчыраю звацца:
Пісала яе жанчына,
Жонка пісала, маці...

Данута ЗАГНЕТАВА

ВЕРШЫ ДЛЯ МАЛЫХ

Я НА МЕСЯЦ ЛЯЧУ

— Ду-ду-ду! —
Я дуджу.
Я на месяц лячу —
Па струменьчыку,
Па праменьчыку,
На вясёлым карабельчыку.
Але месячык-хітрун
Толькі хвосцікам вільне
І падскочыць угару —
Зноў далёка ад мяне.

Не ўцячэш, не ўцячэш,
Бо я вырасту яшчэ!

* * *

Сонца жмурыцца,
Сонца хмурыцца,
Сонца стрэхі пералічвае.
Выйшла з хаты
ў вясну на вуліцу
Перапёлачка
Невялічкая.
Пазяхнула соладка-соладка,
З воч праменьчык паслала
Да сонейка,
У караблік скокнула
козачка,
Ад мяне
паехала ў казачку.

* * *

Лёгкае,
белае —
па загонах бегае,
чыстае,
сіняе —
вісне над асінаю.
Мяккае,
калматае —
туліцца за хатаю.
Я шапчу затоена:
Хто яно?
Што яно?

ЧЫНГІСХАН

АПАВЯДАННЕ

Алена ВАСІЛЕВІЧ

Гэта мая трохгадовая суседка... Пачакайце, пачакайце, не перабівайце. Няма ніякай памылкі. Паўтараю: і суседка і Чынгісхан... У кароценькай ружовай сукенцы, з белым капронавым бантам на ўсю галаву, з гарэзлівымі чорнымі вочкамі... Яны то хаваюцца, нібы мышкі, у раскосых, вузенькіх шчылінках, калі Чынгісхан заходзіцца ад смеху, то льюць ручаём слёзы, калі Чынгісхан абавязкова хоча паставіць па-свойму, а гэта ніяк не ўдаецца. А то яшчэ гэтыя вачаняты ўмеюць хітра-хітра цікаваць за сваёй ахвярай: якога-небудзь карапуза, якога ў гэты самы момант Чынгісхану неабходна стукнуць па галаве...

А на самай справе ў суседкі мае — Чынгісхана — імя самае лагоднае, самае ласкавае: Алёнка... Праўда, карыстаюцца ім звычайна толькі Алёнчыны тата з мамай. А на вуліцы за свае раскосыя татарскія вочкі і за буйны нораў Алёнка адклікаецца на Чынгісхана...

Упершыню з'явілася яна на нашым двары гэтай зімою. Бягу я неяк з работы дадому (на вуліцы маразіна!) і ля свайго парога раптам страчаю круглую кадушачку, апрануту ў чырвонае палітцо, у валёнках, у пуховай хустцы. Каб не мёрзла, кадушачку падперазалі напружжай. Цікавая асоба. Цікава пазнаёміцца. Хачу зазірнуць кадушачцы ў твар, а ў яе з-пад насунутай на самы лоб хусткі тырчыць толькі выцягнуты, як у вожыка, лычык. Такі пацешны, такі сімпатычны.

— Добры дзень вам, лычык! — вітаюся я з кадушачкай.

А яна раптам як фыркне на мяне:

— Ідзі!

Вось дык знаёмства.

Тут да кадушачкі падбегла мама (яна стаяла непадалёку з суседкай), пачала ўшчуваць яе, хацела нават набіць, ды я заступілася:

— Ну за што ж вы яе? Яна ж разумная дзяўчынка...

У адказ кадушачка толькі бліснула на мяне хітрымі раскосымі вочкамі і яшчэ больш надулася: мусіць, не паверыла...

Праўда, потым адносіны ў нас наладзіліся. Цяпер Алёнка страчае кожны раз мяне з работы цудоўнай заявай:

— Я пайду да вас!

І няхай толькі не здолею я якнебудзь адхіліць гэту выдатную заяву, як яна ўмомант абгоніць мяне і праз хвіліну ўжо малоціць кулакамі і нагамі ў нашы дзверы.

Звычайна я хачу абхітрыць Чынгісхана.

— У нас жа яшчэ няма нікога дома.

— А вось і ёсць!—і не думае нават зважаць на маю нядалую дыпламатыю Чынгісхан, апярэджваючы мяне па лесніцы. Па дарозе яна паведамляе мне:

— Мы будзем гуляць у лялькі.

«Мы» — гэта азначае, што на нашай пляцоўцы Чынгісхан прыхопіць яшчэ сваю сяброўку — сінявокае, шаўкавістае, нібы з мяккага лёну, стварэнне— Наташу.

Сваё абяцанне Чынгісхан не кідае на вецер. Не паспяваю я распрануцца, як у дзверы пачынаюць малаціць у дзве пары чаравік і кулакоў.

Гэта ідуць госці.

Гасцей гэтых, вядома, можна было б і адправіць — няхай бы лепей гулялі на вуліцы, але ў іх ёсць заступніца — мая дачка. Яна, хоць ужо і круціцца па гадзіне перад люстрам, таксама не адмаўляецца яшчэ пагуляць у лялькі з Чынгісханам і Наташай.

— Ах вы, мае абязьяны! — сустракае яна гасцей.

— Ах ты, мая базяна! — адказваюць ёй госці.

Агульная мова знойдзена. Госці падаюць на тахту жыватамі, дрыгаюць у захапленні нагамі, штурхаюцца, пішчаць, рагочуць.

Гэта нешта накшталт рытуалу.

Я безнадзейна махаю рукой: тут ужо нічога не зробіш: «Базяны» сапраўды.

Потым мы садзімся абедаць.

— Мы таксама хочам есці! — патрабуе звычайна першай Чынгісхан.

— Мы таксама хочам есці! — уторыць Наташа.

— Вашы мамы хіба не кармілі вас дагэтуль? — пытаемся мы у гасцей.

Не маргнуўшы, абедзве глядзяць святымі вачыма:

— Не, не кармілі.

— Ах, якія кепскія вашы мамы!

— Ах, якія кепскія васы мамы! — хорам паўтараюць госці.

— Ну, тады мыць рукі!

— Я не хачу! — умошчваецца на зэдлік Чынгісхан.

— І я не хацу! — паўтарае ўслед Наташа.

— Ну, тады марш з-за стала.

— А я не хачу! — не могучы топнуць, махае ў паветры нагой Чынгісхан і стукае смуглым кулачком па стале.

— І я не хацу! — тое ж самае паўтарае Наташа і таксама пляскае па стале беленькай незагарэлай далонькай.

— Ах вы, неслухі! — мая дачка бярэ гасцей за рукі і вядзе ў ванны пакой.

Госці ўпіраюцца, вішчаць, заходзяцца ад смеху, але ідуць усё ж.

Пасля мыцця Чынгісхан імкнецца зноў захапіць ініцыятыву ў свае рукі.

— Мы не хочам баршчу!

— Мы не хочам барсцу!—крычыць і Наташа.

— А што ж вы хочаце?

— Я хачу яйцо! — патрабуе Чынгісхан.

— І я хачу айцо! —уторыць Наташа.

— Айца няма. Ешце сырнікі са смятанай.

Бяруць відэльцы, поркаюць сырнікі, мачаюць іх у смятану, аблізваюць.

— Нясмачна! — неўзабаве паведамляе Чынгісхан.

— Нясмачна!—з набітым ротам бразгае відэльцам і Наташа.

— Ах вы, парасяты! — не вытрымлівае дачка. — Вось я вас зараз!

— Ты сама парасята! — не застаюцца ў даўгу гарэзніцы і тут жа патрабуюць:

— А што вось гэта — хочам гэтага!

—Гэта кісель.

— Хочам кісялю! Хочам кісялю! — што сілы адна перад другой крычаць госці.

— Дай ім, калі ласка, кісялю і забірай іх хутчэй з-за стала,— прашу я дачку.

Пасля кісялю пачынаецца другое мыццё. А затым пачынаюцца ляльки, мішы, пачынаецца чытанне, маляванне, спевы.

— «Пусть всегда буду я-а-а»...— на адной ноце, чамусьці заўсёды з канца, пачынае Чынгісхан.

— «Пусть всегда будет м-а-а-ма! — успамінае пра маму Наташа.

...Штурхаючыся і збіваючы адна другую, яны працягваюць шматаваць на кавалачкі песню:

— «Пусть всегда будет п-а-апа!»

— «Пусть всегда будет б-а-абушка!».

Ах, якую святую праўду яны спяваюць!..

Потым на нейкі час усё сціхае — госці заняліся сур'ёзнай справай. Заходжу праз некаторы час да іх у пакой... Госпадзі! Чынгісхан стаіць з нагамі на пісьмовым стале і з выглядам чалавека, занятага самай сур'ёзнай справай, цягнецца да партрэта Пушкіна. Ёй абавязкова трэба яго зняць і... скінуць на падлогу. На падлозе ўжо ляжыць левітанаўскі «Сакавік», падлога ўсцелена ўжо газетамі і часопісамі. На гэтай паляровай пярыне, сціскаючы ў абдымках ляльку, валяецца Наташа.

— Што ж гэта вы нарабілі, нягодніцы? — не вытрымліваю я.

— Ідзі! Ідзі!—тупае на мяне па стале нагою Чынгісхан.

— Ідзі! Ідзі! — махае нагою ў паветры і Наташа. Ёй лянота ўставаць, аднак не хочацца адставаць і ад Чынгісхана.

— Дзеці, —іду я на хітрасць,— вас клічуць дадому ўжо вашы мамы.

— Ай! Не хочам дадому! — у адзін голас крычаць сваволіцы і як мага ціснуцца пад стол — хаваюцца ад мам.

І калі мамы сапраўды прыходзяць, іх вачам адкрываецца відэвішча, якое можна параўнаць з полем бою, пакінутым працўнікам.

— Божа мой! — усплескваюць рукамі мамы. — І навошта вы іх церпіце? Навошта вы пускаеце іх да сябе?

Дзівачкі... «Навошта?» Ну, як ты іх не пусціш, як ты іх не будзеш «цярпець»? Гэтых чынгісханаў...

Марыя МАЙСЕЕВА

АБ ЧЫМ ДУМАЮЦЬ МАМЫ

Я іду дадому скарэй,
Хто страчае мяне ля дзвярэй!
Сустракае мяне сынок —
Мой малы шчабятун, мой званок.
Ох і слаўны ж сынок, ох і слаўны!
Ён хадзіць навучыўся нядаўна.
А ў дачушкі — ужо каса,
Падрастае мая краса.
Вераснёвым дзяньком вясёлым
Пабяжыць яна скора ў школу.
Засынаюць дзеткі мае,
Думкі рояцца ў галаве.
Можа, рана гадаць пакуль,
Чым займуцца іхнія ручкі!
Што па сэрцу будзе сынку,
Атрымаецца што з дачушкі!
Знаю, знойдуць свой шлях яны,
Зорка шчасця ўсім засвеціць.
Толькі б чорны віхор вайны
Не гуляў па планеце.

Пераклад з рускай В. ВЯРБЫ.

Алена КОБЕЦ-ФІЛІМОНАВА

ЛЮБІМЫЯ НОТЫ

Дзяўчынка іграла на раялі. Яе пальчыкі шпарка бегалі па клавішах. Нот набралася многа-многа! Стала ім цесна. Яны звонкімі гарошынамі рассыпаліся па падлозе, пакаціліся на расчынены балкон, а з балкона на тратуар...

Унізе праходзілі людзі. Яны лавілі ноты і з добрай усмешкай неслі іх з сабой. Гэта ж былі іх любімыя ноты: дзяўчынка іграла аб міры, аб дружбе, аб шчасці.

Дзяўчынка іграла, а ноты ўсё падалі, падалі... Іх было так многа, радасных, пявучых, звонкіх! Збіралі іх людзі. На дапамогу ім прыляцелі птушкі, падхапілі ўсе ноты да апошняй і паляцелі з імі па ўсёй зямлі.

Так разнеслася песня пра мір.

ПУНСОВЫЯ МАКІ

Па зялёнаму гаю, залітаму яркім, вясновым сонцам, ідзе стройная басаногая дзяўчына. Чаравікі яе перакінуты цераз плячо, за спіной — рукзак. Яна ідзе не сцяжынкай — прадзіраецца скрозь густыя калючыя зараснікі. На яе руках, нагах, на твары чырванеюць драпіны. З іх сочыцца кроў і капае на зямлю. Але дзяўчына не адчувае болю.

Поступ яе ўпэўнены. Яна дапытліва глядзіць перад сабой. Галава яе прыўзнята, у вачах — малады запал, на вустах — дзёрзкая ўсмешка. Усё аблічча дзяўчыны невыказна прыгожае. Яе не раз услаўлялі паэты, мастакі, кампазітары.

Гэта — маладосць. Яна не адчувае стомы і не затрымліваецца ні на момант. Ёй няма калі. Яна спяшаецца: наперадзе многа спраў. І таму яна ідзе напрасткі, выбіраючы непракладзеныя шляхі, каб скараціць час. Яна ідзе, пакідаючы за сабой шырокую сцежку. А на тым месцы, куды капне кроў, вырастаюць пунсовыя макі.

Пунсовыя макі — сляды маладосці, адважнай, дзёрзкай, нястрымнай.

Пунсовыя макі — сімвал маладосці, якая не праходзіць бясследна.

Калі галоўны інжынер Віцебскай трыкатажнай фабрыкі «КІМ» А. Севасцьянава была ў камандзіроўцы ў Чэхаславакіі, да яе звярнуліся члены брыгады сацыялістычнай працы панчошна-трыкатажнага прадпрыемства «Элітэ». Чэшскія рабочыя прасілі дапамагчы ім наладзіць сувязь з беларускімі трыкатажнікамі. Чэхаславацкім сябрам напісалі члены брыгады камуністычнай працы, якую ўзначальвае А. Васільеў. Гэта было тры гады назад. Цяпер паміж беларускімі і чэшскімі рабочымі — моцная дружба. Аб ёй сведчаць пісьмы, фатаграфіі, альбомы, кнігі, якімі абменьваюцца члены брыгад.

У заводскай бібліятэцы давялося нават стварыць спецыяльны куток для захоўвання сувеніраў.

Атрыманы новы альбом з Чэхаславакіі. Пагартаць яго ў заводскую бібліятэку забеглі вязальшчыцы Л. Рошчына і А. Скобелева, начальнік змены С. Жолудава, сакратар цэхавай камсамольскай арганізацыі Г. Локман. У гэты момант і зняў іх наш фотакарэспандэнт.

ЖАНЧЫНЫ, БУДЗЕМ НА ВАРЦЕ

Прысвячаем Сусветнаму кангрэсу жанчын у Маскве

МАРШ

Словы Эдзі АГНЯЦВЕТ

За крокам крок!
Ідуць здалёк
І Ганны,
і Жанэты.
Любоў адна
І кроў адна
Ва ўсіх жанчын планеты.
Адзін парыў,
Адзін матыў,
Адна ва ўсіх трывога:
Абараніць
Сваіх малых!
Вайне закрыць дарогу!
За крокам крок!
Ідуць здалёк
Сіроты з Хірасімы.
І паўстаюць,
На Сход ідуць
Ахвяры Асвянціма.

Музыка Эдзі ТЫРМАНД

Дзявочых кос,
Сірочых слёз
Павек нам не забыцца!
Клянёмся мёртвым
І жывым:
Вайне не паўтарыцца!
За крокам крок!
Ідуць здалёк
І Ганны,
і Жанэты.
Любоў адна
І кроў адна
Ва ўсіх жанчын планеты.
Расці малым,
І жыць жывым!
За намі — перамога.
Масква, як маці,
Кліча нас:
— Вайне закрыць дарогу!



МЕСЦА Ў ПАЭТЫЧНЫМ СТРАІ

(Заканчэнне. Пачатак на 2-й стар.).

Г. Бураўкін мог і павінен быў паставіць сабе большыя патрабаванні, да гэтага абавязвала першая кніга, добрая ўвогуле заяўка на далейшае. Трэба было дамагацца вершаў такога ўзроўню, як тыя, што прыгадваліся, і верш «Здраднік» з вельмі скупым, выразным і моцным заканчэннем.

Прозвішча В. Макарэвіча сустракаецца ў газетах даволі даўно, кніжка з'явілася толькі сёлета. Няйначай гэта тлумачыцца патрабавальнасцю аўтара да сябе. У выніку па невялікай параўнальна кніжачцы мы можам меркаваць і аб творчым абліччы паэта, аб тым, як складаецца яго манера гаварыць вершам, характар ягоных пошукаў. В. Макарэвіч — паэт удумлівы і здольны. Але яму, як многім яго аднагодкам, не заўсёды стае ўмельства закончыць верш. Тады з'яўляюцца такія лёгкаважкія канцоўкі:

Мне б сонцам быць,
каб так вось добрае
Любіць, а зло — агнём паліць,

або:

Я паслізнуцца не баюся,
Як старцу — кій,
мне — пачуццё.

І не нова і ў той жа час цьмяна па выражэнню.

Поруч з такімі недапрацоўкамі з задавальненнем знаходзіш закончаны па думцы, стройны па выкананню верш пра запуск змея, калі хлопцы па нітцы трымалі з небам сувязь, каб стаць потым касманаўтамі. Гэта адзін з лепшых вершаў пра касмічныя палёты, правільней, пра пакаленне, якому удалося іх ажыццявіць.

В. Макарэвіч працуе на так званых карэнных рыфмах. Часамі падшукванне іх прыводзіць да разбурэння вобразаў у радку і вобраза ўсяго верша. Вось што выйшла праз жаданне зрыфмаваць «турнэ» і «труне»:

Урачыста, нібы ў турнэ
Ці ў далёкі паход з прываламі,
Чалавек у сасновай труне
З дому роднага выпраўляецца.

Міма волі аўтара атрымліваецца, што людзі кіруюцца ў падарожжы і паходы толькі ў хваёвых трунах. Дарэчы, такія рыфмы, як «да болю — да дому», пачуць немагчыма. І не на «карэнных», а на самых звычайных, нават збітых рыфмах трымаецца верш В. Макарэвіча: «хаваць — хапаць», «бары—гарыць». Вось тут трэба была большая пераборлівасць.

Падшуквае В. Макарэвіча і прыхільнасць да натуралістычнай дэталі. Без кроплі іроніі паэт кажа: «Маці мной усё не магла чамусьці разрадзіцца». А ў гэты час «па ганку бацька ў сподніках кружыў...». Гэта выклікае смех, хоць не стаўляў таго сабе за задачу аўтар.

Пры добрым нахіле В. Макарэвіча да развагі, па тым, як ён усё больш упэўнена абыходзіцца са словам, можна чакаць, што паэт парадуе нас творамі сапраўднага роздуму, тонкага абагульнення і, вядома ж, менш знарочыстай формы. Пакуль жа гэта знарочыстасць толькі шкодзіць успрыманню.

Першыя вершы А. Наўроцкага былі сустрэты добрай увагаю, надрукаваны ў тоўстым часопісе, выклікалі кваліфікаваны водгук крытыкі. У вершах «Рукі», «Пачатак», «Адгабляваная дошка», лепшых у кнізе «Неба ўсміхаецца маланкаю», якія ўражаюць і запамінаюцца, ёсць падкрэсленая рэчыўнасць, земнасць, грубаватасць. Гэта ўсё вабіць чытача, дзейнічае, як удалы прыём, пакуль не перарастае ў прыналежнасць натуралізму. У паэме «Стрэл у твар смерці» занадта смакуецца працэс гніення: гніюць мільёны лясоў, птушак, акіянаў, нават песень, пацалункаў і ўсмешак. Ці, скажам, гаворыцца так: «Ты адкусвала ад болю агнём палыхаючыя пальцы». Гэта ўсё антыэстэтычна, выпадае з паэтычнага раду і пераходзіць у паталагічны. Апрача таго, чытач ужо сустракаў падобнае гніенне ў адной з ранніх паэм Ул. Бранеўскага. Паўтараць не варта было б.

Відаць, вось гэта захапленне натуралістычнай дэталлю, жаданне выслаўляцца як выйдзе, абы толькі не так, як гавораць іншыя, а ў сувязі з гэтым некаторае мудраванне і невыразнасць выражэння прывялі А. Наўроцкага да напісання рэчаў, якія зараз востра крытыкуюцца за штукарства і нахіл да празмерна чорнага паказу рэчаіснасці. Скажам аб гэтым яшчэ раз строга і добразычліва, каб пачуць ад А. Наўроцкага новае важкае і праўдзівае слова, якога мы можам чакаць ад чалавека, што ўмее сказаць:

Чалавек з космасу апусціўся
На тры мільярды ўгору паднятых
рук.

Перад выданнем новай кнігі паэту трэба падумаць, ці не занадта часта ў яго пафас адмаўлення перавышае пафас сцвярджэння? Ці не мнагавата ў яго радкоў, строф і цэлых вершаў, зразумелых толькі самому? Тады для каго ён працуе?

Невыразнасць, двухсэнсавасць паэтычных фармуліровак даюць магчымасць ператлумачваць вершы, як хто захоча. А за гэтым вельмі ўпадаюць нашы ворагі! Мастацкі твор не можа мець двух сэнсаў, гэта пярэчыць прыродзе мастацтва, тым больш нашага, заснаванага на прынцыпах сацыялістычнага рэалізму.

Знаёмства з новымі вершамі А. Наўроцкага сведчыць, што першая яго кніга пакідала больш светлае ўражанне. Другая можа выглядаць як складзеная з недабіркаў ад першай. Крыўдна ад паэта такіх магчымасцей, як А. Наўроцкі, атрымліваць менш, чым ён можа зрабіць.

Кніга Г. Кляўко «Абветраныя далягляды» правільна названа. Гэта слова пакалення, якое прыйшло пасля вялікай ваеннай навальніцы на абветраны прастор, дзе трэба будавацца, уздымаць разлогі, спяваць песні. У лепшых сваіх вершах «Дарагія кроплі», «Везлі двое сена» Г. Кляўко лаканічны, радуе добрай усмешкаю. Наогул жа кніжка яго выглядае даўгаватай, у аўтара ёсць жаданне растлумачваць тое, што не вымагае тлумачэнняў, а гэта вядзе да павелічэння памеру вершаў. Прыкладна такое ж уражанне расцягнутасці застаецца і ад кнігі Ул. Ляпёшкіна «Ранішнія росы». Даволі ўдалы верш «Яліна ў маскхалаце» тоне сярод многіх невыразных, а то і проста слабых рэчаў. А чытаючы асобныя радкі, бачыш, што магчымасці ў аўтара добрыя, трэба толькі выхоўваць умельства абмяжоўваць сябе, можа, меншым па ахопу, але затое яркім.

Загорнута апошняя кніжка... І з радасцю адзначаеш, што чытанне іх прынесла больш уцехі, чым засмучэння. Па ўзроўню гэтыя кніжачкі, нават зборнік Ул. Карызны, дзе мала сфарміраваных у вершы думак, а толькі больш і менш удалыя радкі, куды вышэй і ва ўсіх адносінах за такія ж тонкія зборнікі, з якімі выходзілі ўпершыню паэты ў 20-х і 30-х гадах. У паэзію ідзе таленавітае, літаратурна граматнае, знаёмае з тэхнікай справы пакаленне. Ужо зараз у гэтым хоры вылучаюцца своеасаблівыя цікавыя галасы. Неўзабаве яны павінны стаць салістамі.

ВЯСЁЛ[...] КАРАНД[...]

Мал. Э. КАЛ[...]

Трагедыя з камедыяй.

КАМЕРНЫ ЦЫКЛ

Камерная музыка ў нашай рэспубліцы знаходзіць сабе ўсё больш доступ да сэрцаў слухачоў, становіцца масавым відам мастацтва. Пра гэта можна меркаваць па завершаным першым цыкле камернага абанемента «Маладыя выканаўцы — лаўрэаты міжнародных конкурсаў і струнны квартэт Белдзяржфілармоніі». Канцэрты абанемента былі арганізаваны не толькі ў Мінску, але і ў буйнейшых гарадах рэспублікі — Віцебску, Гомелі, Баранавічах, Бабруйску, Гродна, Магілёве.

Кіраўніцтва Беларускай філармоніі зрабіла добрую справу, даўшы магчымасць слухачу пазнаёміцца з ігрой тых, каго з захапленнем слухаюць не толькі ў нашай краіне, але і за мяжой.

У канцэртах камернага абанемента прымалі ўдзел лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя І. Славіка і Ф. Ондржычка ў Празе і Міжнароднага конкурсу імя М. Лонг і Ж. Цібо ў Парыжы Жан Тэр-Мергяран (скрыпка), лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя Пабло Казальса і Міжнароднага конкурсу імя Чайкоўскага Валянцін Фейгін (віяланчэль), лаўрэат Міжнароднага конкурсу імя М. Лонг і Ж. Цібо ў Парыжы Ігар Жукаў (фартэпіяна) і лаўрэат Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Варшаве, заслужаная артыстка Азербайджанскай ССР Таміла Махмудава.

У праграму выступленняў скрыпача Ж. Тэр-Мергярана ўваходзілі творы розных стыляў і характараў. Цудоўна былі сыграны ім адажыо і фуга з Санаты соль-мінор Баха, лёгка і проста справіўся ён з цяжкасцямі Капрысаў Паганіні. Каскады складанейшых пасажаў, акорды, флажалеты, двайныя ноты — усе цяжкасці скрыпічнай тэхнікі былі паспяхова пераадолены выканаўцам.

Рэпертуар маладога піяніста І. Жукава складаўся з камерных твораў Баха, Моцарта, Бетховена, Брамса, фартэпіянных цыклаў Шумана і Чайкоўскага. Вялікую ўвагу аддае музыкант фартэпіянным творам вядучых савецкіх кампазітараў. Піяніст імкнецца да змястоўнасці і глыбіні трактоўкі кожнай п'есы. І нязменны гарачы прыём слухачоў—лепшы доказ яркасці і даходлівасці выканаўчага майстэрства І. Жукава.

Вельмі цікава прайшлі выступленні віяланчаліста В. Фейгіна. Яго імя стала вядома шырокаму колу аматараў музыкі пасля Міжнароднага конкурсу імя Пабло Казальса, дзе малады выканаўца заваяваў адно з прызавых месц. Ігры В. Фейгіна ўласцівыя насычанасць гучання, эмацыянальная прыўзнятасць і маштабнасць выканання. Бездакорным густам, адсутнасцю якой бы там ні было эфектацыі было прасякнута выкананне Фейгіным Сюіты до-мажор Баха для сола віяланчэлі. Нашаму госцю ўдалося па-сапраўднаму падкрэсліць жыццёвасць, энергію, валявы аптымізм гэтай музыкі. Асабліва добра прагучалі такія часткі санаты, як «Сарабанда», два «Бурэ» і «Жыга». Творчасць маладога артыста па-сапраўднаму захапіла публіку.

Тэрыторыя Віцебскага дывановага камбіната ператвараецца ў квітнеючы сад. Ва ўсіх цэхах створаны групы аматараў прыроды, якія падтрымліваюць парадак на замацаваных за імі ўчастках.

На здымку: актывістка заводскага азелянення ткачыха Лідзія Чуй.

Фота А. ДЗІТЛАВА.

Пасля выступленняў заслужанай артысткі Азербайджанскай ССР Т. Махмудавай да арганізатараў гэтых музычных вечароў падышоў адзін з аматараў, пажылы чалавек, і сказаў, што яму даводзілася чуць нямала добрых піяністаў, але канцэрт маладой артысткі надоўга застанецца ў яго памяці. Сапраўды, маладая артыстка іграе са шчырым тэмпераментам, вобразна, глыбока, без найменшага намёку на вонкавы эфект. Нават пры выкананні вельмі добра вядомых твораў, як, напрыклад, Санаціна Равэля, «Востраў радасці» Дэбюсі, «Танец агню» дэ Фалья, Т. Махмудава знаходзіць новыя фарбы, па-свойму раскрывае ўсё багацце музычнага зместу. Піяністка цудоўна валодае майстэрствам «спявання» на раялі — кантылена гучыць у яе працяжна і выразна, музычная фраза развіваецца натуральна і свабодна. І не дзіўна, што канцэрты Тамары Махмудавай у філарманічным абанеменце прайшлі з поспехам.

А цяпер хочацца спыніцца на канцэрце (ім закончыўся абанемент), які з'явіўся свайго роду прыемным сюрпрызам для нашых слухачоў. Справа ў тым, што ў гэтым канцэрце ўпершыню выступіў новы калектыў, створаны Беларускай філармоніяй у сёлетнім сезоне, — струнны квартэт у складзе М. Браценнікава (1-я скрыпка), Г. Клачко (2-я скрыпка), заслужанага артыста БССР П. Кірыльчанкі (альт) і Б. Скабло (віяланчэль). Кіраўніцтва філармоніі пераадолела шмат цяжкасцей пры стварэнні яго, і першыя публічныя выступленні паказалі, што гэта было не дарэмна. Нягледзячы на тое, што творчы калектыў вельмі малады, яго ўдзельнікі здолелі за кароткі тэрмін набыць добрае пачуццё ансамбля.

Квартэтная музыка — музыка вялікіх псіхалагічных абагульненняў і тонкіх лірычных дэталей. Для таго, каб данесці яе да шырокіх мас слухачоў, артысты павінны знітавацца ў адзіны сплаў, павінны глыбока пранікнуць у задуму кампазітара.

Канцэрты струннага квартэта Беларускай філармоніі, якія з поспехам прайшлі ў Баранавічах, Гродна, Магілёве і іншых гарадах, паказалі, што калектыў у значнай ступені набыў неабходныя для гастрольнай дзейнасці якасці.

Выступленне нашага квартэта было апошнім у праведзеным цыкле абанементных вечароў. Яно адбылося ў актавай зале Белдзяржуніверсітэта. Малады калектыў здолеў пранікнуць у музычную драматургію твораў, узмацніць у іх драматычны кантраст, што надало шырокае дыханне трактоўцы Шостага квартэта Бетховена і асабліва Восьмага квартэта Шастаковіча (ён выконваўся ў Мінску ўпершыню).

Менш цікава прагучаў Пяты квартэт Глазунова. У сувязі з гэтым хочацца выказаць заўвагу, што выкананне ў адным канцэрце адразу трох квартэтаў абцяжарвае праграму.

У канцэрце струннага квартэта прыняла ўдзел салістка Белдзяржфілармоніі А. Купрыянава (мецца-сапрана), якая выканала рад папулярных рамансаў.

Камерная музыка — важная галіна ў музычным выхаванні народа. Трэба, каб добрая ініцыятыва, праяўленая нашай філармоніяй у гэтым канцэртным сезоне, падтрымлівалася і надалей і асабліва за кошт выканаўчых сіл нашай рэспублікі.

М. ІВАНОЎ.

НОВАЕ ВЫХОДЗІЦЬ НА СЦЭНУ

Яшчэ рэдка ў кітайскай сталіцы можна ўбачыць афішы і газетныя аб'явы аб балеце. Але галоўнае не ў гэтым. Важна, што гэты самы малады ў рэспубліцы від тэатральнага мастацтва выходзіць на сцэну. Паявіліся спектаклі, пра якія звычайна гавораць «удалы». Нараджэнне балета ў Кітаі — гэта вынік пасляровалюцыйнага імкнення народа да ведаў, да культуры. Фарміраванне балета ў Кітаі ішло і ідзе пад непасрэдным уплывам савецкага балета.

У першыя гады пасля вызвалення ў Кітайскай Народнай Рэспубліцы гастраліравалі многія савецкія мастацкія і тэатральныя калектывы. На кітайскай сцэне выступалі такія майстры савецкага балета, як Г. Уланава, В. Лепяшынская, М. Плісецкая. Незабыўныя апошнія гастролі балета Вялікага тэатра ў дні святкавання 10-годдзя КНР. Ля калыскі кітайскага балета стаялі савецкія балетмайстры і артысты, якія працавалі ў Пекіне па запрашэнню кітайскага ўрада ў якасці савецкіх спецыялістаў.

— Гэтыя савецкія людзі, — гаворыць кіраўнік кафедры вывучэння балета Пекінскага харэаграфічнага вучылішча Чжан Сюй, — аказалі нам неацэнную дапамогу ў стварэнні і развіцці балета. Часта і цёпла мы ўспамінаем іх.

Таварыш Чжан з глыбокай удзячнасцю расказвае пра тое, колькі працы і ведаў паклалі яны, каб выхаваць першых у Кітаі сапраўдных майстроў балета. Я слухаў таварыша Чжан Сюя і ўяўляў сабе ўжо немаладога, але па-юнацку энергічнага і падзелавому неспакойнага заслужанага артыста РСФСР Пятра Андрэевіча Гусева, сціплую і простую Валянціну Румянцаву, з якімі мне не раз давялося сустракацца ў Пекіне. Я ўспомніў спякотныя, душныя вечары пекінскага лета. Стомленыя, але задаволеныя тым, што і сёння яны перадалі сваім маладым кітайскім сябрам частку свайго майстэрства, вярталіся вечарамі з працы ў гасцініцу мае знаёмыя Пётр Андрэевіч і Валянціна.

— Хао (добра), — звычайна з усмешкай адказваў задаволены Гусеў на маё традыцыйнае пытанне «ну як?»

...У 1954 годзе, працягваў свой расказ Чжан Сюй, у Пекіне было створана першае ў гісторыі кітайскага мастацтва харэаграфічнае вучылішча, у сценах якога выхоўваліся такія таленавітыя балерыны, як Бай Шусян, Чжан Вань-чжао і іншыя. Цяпер у класах двух аддзяленняў вучылішча — класічнага і нацыянальнага балета — вучыцца больш 300 будучых артыстаў. За восем гадоў вучылішча скончыла 180 чалавек.

У Кітаі яшчэ няма самастойнага балетнага калектыву, але пры вучылішчы тры гады назад была створана балетная трупа, у якой цяпер 80 артыстаў.

— Але ж для пастаноўкі вялікага балета,—зазначае Чжан Сюй, — трэба 100, а то і 200 артыстаў. Таму ў спектаклях побач з прафесіянальнымі артыстамі трупы ўдзельнічаюць выкладчыкі і навучэнцы старшых класаў вучылішча.

У пастаноўцы выпускнікоў вучылішча, якія склалі першую балетную трупу краіны, ідуць «Лебядзінае возера», «Карсар», «Жызель». Нядаўна пекінцы ўбачылі «Бахчысарайскі фантан». Цікава адзначыць, што калі папярэднія балеты — «Лебядзінае возера», «Карсар», «Жызель» — пастаўлены цалкам савецкімі балетмайстрамі, у прыватнасці П. Гусевым, дык «Бахчысарайскі фантан» пастаўлен кітайскім балетмайстрам трупы Ван Сі-сянам — выхаванцам Маскоўскага мастацкага інстытута.

Характэрнай рысай развіцця балета ў Кітаі з'яўляецца яго развіццё па двух напрамках. Асаблівую цікавасць у гэтых адносінах мае нацыянальны балет.

— Нацыянальны балет, — тлумачыць мой субяседнік,—па змесце і форме з'яўляецца кітайскім, мова танца—кітайская, жэсты, музыка—кітайскія. Ён цесна звязаны з традыцыйнымі народнымі танцамі і народнай музычнай творчасцю. У той жа час ён запазычвае некаторыя элементы класічнага балета.

І сапраўды, калі глядзіш кітайскі нацыянальны балет, лёгка заўважаеш уплыў умоўнасцей кітайскай оперы. Нацыянальны балет яшчэ не склаўся, ён перажывае перыяд станаўлення. Першым нацыянальным балетам быў спектакль «Чароўны ліхтар», за ім паявіліся яшчэ два — «Прыгажуня-рыбка», «Грамадства малых мечаў». Усе гэтыя балетныя спектаклі па сваёй форме не падобны адзін на адзін. «Прыгажуня-рыбка», напрыклад, мае вельмі многа характэрнага для класічнага еўрапейскага балета. Мне прыгадваецца яго прэм'ера... У напружанай цішыні змоўклі апошнія гукі аркестра, апусцела сцэна. Нейкае імгненне глядзельная зала яшчэ жыве ўбачаным, і раптам пад яго скляпеннямі ўспыхвае бура апладысментаў. Гледачы зноў і зноў выклікаюць артыстаў—стваральнікаў гэтага паэтычнага балета... Яшчэ раз узнімаецца заслона, і вось на сцэне таленавіты калектыў і чалавек са збянтэжанай усмешкай, які ўдыхнуў жыццё ў народную кітайскую легенду, што нагадвае нашы легенды пра русалак, — савецкі спецыяліст П. Гусеў.

— З такім спектаклем ужо можна выходзіць на вялікую сцэну, — сказаў тады Пётр Андрэевіч.

Такім чынам да краін, у якіх існуе сусветны класічны балет, далучылася яшчэ адна краіна—сацыялістычны Кітай.

М. ЯКАЎЛЕЎ,
Пекін. карэспандэнт ТАСС.

МЕЛОДЫІ—ПОШТАЙ

Усесаюзная студыя грамзапісу выпусціла ў дапамогу слухачам народных універсітэтаў культуры рад доўгаіграючых грампласцінак.

«Вучыцеся слухаць музыку»— так называецца лекцыя кандыдата мастацтвазнаўства І. Несцьева, разлічаная на шырокія колы аматараў. У ёй расказваецца пра грамадскае значэнне і спецыфіку музычнага мастацтва, пра вакальную і інструментальную музыку і яе выразныя сродкі. Асноўныя палажэнні лекцыі ілюструюцца музычнымі прыкладамі, што дапамагае яе ўспрыманню і засваенню.

«Праграмная музыка»—пад такой назвай выпушчана пласцінка з лекцыяй Е. Шышовай-Горскай.

У лекцыі кандыдата мастацтвазнаўства М. Сабінінай «Інструменты сімфанічнага аркестра» ў папулярнай форме расказваецца пра сімфанічны аркестр, пра асноўныя групы яго інструментаў, пра магчымасці кожнага з іх. Гэтая лекцыя таксама суправаджаецца музычнымі прыкладамі.

Гутарка Б. Цеўліна «Вучыцеся добраму спяванню», дадзеная ў грамзапісе, расказвае аб прынцыпах фарміравання хораў, дае ўяўленне аб розных відах харавога мастацтва.

Выпушчана анталогія рускай савецкай песні—«Песні нашай Радзімы». Гэта цэлы камплект, які складаецца з дванаццаці пласцінак. У анталогіі адлюстроўваецца ў асноўных рысах гісторыя нашага песеннага мастацтва—ад песень і гімнаў перыяду Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны да патрыятычных песень сённяшняга дня.

Анталогія «Рускія народныя інструменты» знаёміць слухачоў з гучаннем рускіх народных музычных інструментаў, з рознымі жанрамі народнай інструментальнай музыкі. У анталогію ўключаны народныя найгрышы, песні, танцы і творы савецкіх кампазітараў, напісаныя для ансамбляў і аркестраў народных інструментаў, а таксама рад твораў класічнай музыкі ў пералажэнні. Да камплекта пласцінак прыкладаецца брашура Б. Смірнова.

Грампласцінка «Гавораць пісьменнікі» мае фанаграмы выступленняў Л. Талстога, М. Горкага, А. Серафімовіча, А. Купрына, В. Верасаева, А. Талстога, А. Луначарскага, В. Брусава, Ул. Маякоўскага, С. Ясеніна, Э. Багрыцкага, А. Фадзеева, М. Астроўскага, П. Паўленкі, Ус. Вішнеўскага і А. Даўжэнкі, галасы якіх былі запісаны ў свой час на фанограф, на грампласцінкі або магнітафон.

Падпіска на пласцінкі адкрыта з 1 чэрвеня па 1 ліпеня 1963 года ва ўсіх магазінах культгандлю.

Гэтыя камплекты музычных дапаможнікаў акажуць каштоўную дапамогу слухачам універсітэтаў культуры, культурна-асветным установам і аматарам музыкі.

М. КОЛАС.

ЛІТАРАТУРНЫЯ СУСТРЭЧЫ

Барысаў — горад літаратурных традыцый. Тут штомесячна праводзяцца сустрэчы з пісьменнікамі, арганізоўваюцца літаратурныя вечары, канферэнцыі і дыспуты па творах беларускіх і рускіх пісьменнікаў. За апошні час у Барысаве пабывалі А. Кулакоўскі, А. Вольскі, Ул. Нядзведскі, Р. Барадулін. Яны прынялі ўдзел у дыспутах і вечарах.

Днямі тут пачаўся Тыдзень беларускай кнігі. На запалкавым камбінаце, у клубе імя Чарняхоўскага, на пляцоўцы летняга кінатэатра адбыліся сустрэчы з Я. Брылем, Э. Агняцвет, Ул. Карпавым, П. Кавалёвым. Удзельнікі сустрэч гаварылі аб новых творах беларускіх пісьменнікаў, аб ролі літаратуры ў выхаванні моладзі.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

ФРАНСУАЗА Ў БЛАКІТНЫХ ПАНЧОХАХ

У азнаменаванне продажу 100-тысячнай пласцінкі з моднай песенькай «Франсуаза ў блакітных панчохах» у адным з клубаў на Елісейскіх Палях быў праведзены конкурс па выбару «Франсуазы»— прыгожай дзяўчыны, падобнай на гераіню песенькі. Выбар выпаў на дваццацігадовую цырульніцу Жыльберту Перын. Двое маладых людзей, выбраных у журы, урачыста надзелі «Франсуазе» блакітныя панчохі. Уся працэдура транслівалася па тэлебачанню.

«Юманітэ».

ВАЖНАЕ ПЫТАННЕ

Прафесар тэалогіі Іаган Удэ (Аўстрыя) выпусціў брашуру, у якой папракае Ватыкан за тое, што да гэтага часу не вырашана пытанне аб колькасці дзейсных запаведзей. Няясна, піша прафесар, ці з'яўляецца пятая запаведзь «Не забі!» абсалютнай або дапускаецца адмяняць яе ў некаторых выпадках. Прафесар Удэ патрабуе хутчэйшага вырашэння гэтага пытання, таму што ад яго залежыць захаванне міру ва ўсім свеце.

«Вохенпост».

КАНКУРЭНЦЫЯ І МАРАЛЬ

Вярхоўны суд штата Нью-Йорк прызнаў негрунтоўным абвінавачанне ў амаральнасці, выстаўленае супраць уласніка аднаго з фешэнебельных начных клубаў. Канкурэнты абвінавачваюць уласніка гэтага клуба ў тым, што ён у мэтах прыцягнення наведвальнікаў апрануў афіцыянтак «зайчыкамі». У выніку праведзенага расследавання Вярхоўны суд устанавіў, што праз адзенне «зайчыкаў» відаць не больш, чым праз іншы купальны гарнітур, а заечыя вушы, прымацаваныя на прычосцы, не могуць лічыцца амаральнымі.

«Фольксштымме».

ВЫДАТНЫЯ МЯСЦІНЫ ДЛЯ ТУРЫСТАЎ

Французскі камісарыят па справах турызму выдаў праспект для замежных турыстаў. Пералічваючы выдатныя мясціны французскай сталіцы, складальнікі праспекта пачынаюць з апісання кабарэ «Шалёны конь» са славутымі дванаццацю актрысамі стрыптыза. У праспекце гаворыцца: «Гэта выдатнае і разам з тым надзвычай цяжкае мастацтва. Яно патрабуе ўмення расцягнуць распрананне на дзесяць хвілін і зрабіць гэта так, каб гледачы не страцілі цікавасці».

«Вохенпост».

ПАСТАР-САМАГОНШЧЫК

Суд у Нэшвілі (ЗША) прыгаварыў пастара Бернарда Свейна да грашовага штрафу ў 10 доляраў за выраб самагонкі. Каб не купляць віно, патрэбнае для прычашчэння ў час богаслужэння, пастар пачаў рабіць спіртныя напіткі сам. Паліцыя, прываблена ў божы храм пахам спіртнога, зрабіла вобыск і знайшла 250-літровую бочку з брагаю і самагонны апарат.

«Ліберасьён».

СПОРТ І РЭЛІГІЯ

Па спецыяльным указанні Баварскага міністэрства культуры ў Мюнхенскім педагагічным інстытуце выкладанне фізкультуры праводзіцца асобна для студэнтаў-католікаў і студэнтаў -[...]таў.

«Во[...]

Аддзел вядзе [...] кафедры замеж[...] Віцебскага мед[...]га інстытута Л. [...]на.

У ТЭЎТО[...] ДАСПЕ[...]

У мэтах б[...] узрастаючым [...] тызмам мюнх[...] ліцыя прыст[...] забеспячэння [...] ліцэйскіх ку[...] вальнымі [...] касцюмамі, я[...]ваюць даспех[...]скіх рыцараў[...]

«Ліб[...]

НА КАРЫСЦ[...]

Дзякуючы [...] ветэрынарнай [...]ны і прагрэс[...]ловасці, якая [...] кансервы д[...] сярэдняя пр[...] жыцця хатня[...] ў ЗША пав[...] за апошнія га[...] да дванаццат[...] Згодна стат[...] дадзеных, тол[...]нулы год на ў[...] хатніх сабак [...] выдаткавана [...] мільёнаў дол[...]

«Фольк[...]

РЭПЛІКА

«ТАПАГРАФІЯ» КНІЖНАГА ГАНДЛЮ

Гэта не зусім звычайная вуліца. Стаяць на ёй адзін супраць аднаго два кінатэатры, дзве аптэкі, два рыбныя склады, два кніжныя магазіны...

Не будзем, аднак, фантазіраваць. Няма такой вуліцы з двума кінатэатрамі, дзвюма аптэкамі, двума рыбнымі складамі, двума...

Зрэшты, вуліцу з дзвюма кнігарнямі можам назваць. Гляньце, калі ласка, на накладныя, якія адпраўляе Брэсцкая база аблкнігагандлю. Бачыце, на адной напісана: «Пінск, вуліца Ленінская, дом 30, кніжнаму магазіну». На другой: «Пінск, вуліца Ленінская, дом 29, кніжнаму магазіну».

Не, на базе не памыляюцца. У Пінску сапраўды дзве кнігарні на адной вуліцы, адна насупраць другой.

Ф. Айзенберг, загадчык магазіна № 8, што на правым баку, нічога не мае супраць Н. Кашко, загадчыцы магазіна № 9 на левым баку.

— У буржуазнай краіне такая сітуацыя называлася б канкурэнцыяй, — гаворыць ён, — а мы з Нінай Сцяпанаўнай жывём дружна.

Загадчыкі магазінаў сапраўды жывуць дружна, але аднаго яны ніяк не могуць зразумець: чаму ў горадзе так дрэнна ідзе гандаль кнігамі.

Гадавы план магазіна № 8 — 32 тысячы рублёў, а месячны план магазіна № 9 крыху большы за шэсць тысяч.

— Не цікавяцца пінчане кнігамі, — уздыхаюць загадчыкі.

Простая думка, што кніжны гандаль залежыць і ад «тапаграфіі», што «гандлёвыя кропкі» трэба набліжаць да пакупніка, не прыходзіць ім у галаву.

У горадзе ўсяго адзін кніжны кіёск і некалькі латкоў, але ўсе яны, як і магазіны, размешчаны за сотню метраў адзін ад аднаго. Дзённая выручка некаторых латочнікаў не дасягае і дзесяці рублёў. У той жа час на Пінскім аўтавакзале няма ніводнага латка кнігагандлю. А тут, паводле сведчання дыспетчараў, штодзённа бывае не менш чатырох тысяч пасажыраў.

У Пінску знаходзяцца буйныя прамысловыя прадпрыемствы, восем тэхнікумаў, адных студэнтаў у горадзе шэсць тысяч. Узяць бы ды і арганізаваць на заводах і фабрыках, у навучальных установах гандаль кнігамі на грамадскіх асновах!.. Але як загадчыкам магазінаў займацца грамадскім гандлем, калі большую частку свайго часу яны праводзяць на складах.

У магазіна № 8 — свой склад, у магазіна № 9—свой. Карлікавы гандаль не дазваляе нармальна будаваць работу магазінаў, і загадчыкі адначасова выконваюць абавязкі кладаўшчыкоў.

Аб'яднаць бы ўсе магазіны ў адзін (у Пінску ёсць яшчэ адна кнігарня са сваім загадчыкам-кладаўшчыком), прызначыць аднаго дырэктара, аднаго кладаўшчыка — у межах тых жа штатаў! Але ў Брэсцкім аблкнігагандлі не любяць «навін». Тут змірыліся і з бязглуздай «тапаграфіяй» пінскага кніжнага гандлю, і з мізэрнымі прыбыткамі ад магазінаў, і з тым, што на складах затаварваецца на дзесяткі тысяч рублёў літаратуры. «Канкурэнцыя» ж не пагражае брэсцкім кніжнікам, а патрабаваць з іх, відаць, няма каму.

У Пінску будуюць цяпер новы кніжны магазін. «Па метражу прылаўкаў яму не будзе роўных у вобласці», — з гонарам заяўляюць у Брэсце. Але ніякая «даўжыня прылаўкаў» не выратуе пінскіх кніжнікаў пакуль яны не арганізуюць як след пазамагазінны гандаль, не пойдуць насустрач пакупніку, пакуль іх «гандлёвыя кропкі» будуць дубліраваць адна адну.

Не, не крыўдзяцца загадчыкі пінскіх магазінаў. Без цяжкасці выконваюць яны заніжаныя планы, атрымліваюць прэміі. Нічога не трацяць і іх брэсцкія начальнікі. Але ў пройгрышы дзяржава, тыя, хто адпраўляе кнігу ў далёкі шлях, чытач, да якога яна не даходзіць.

Ф. ХІНІЧ.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУ[...], Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШ[...], В. Б. ЛАДЫГІНА, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. М[...], І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэд[...]), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава[...] Тэлефоны: прыёмнай р[...]цыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказ[...] сакратара — 3-22-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела ма[...]тва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацы[...] 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 10290.